# КОДЭКС УНУТРАНАГА ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
24 чэрвеня 2002 г. № 118-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 29 мая 2002 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 6 чэрвеня 2002 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 134-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 106, 2/1233) <H10600134>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 137-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235) <H10600137>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 г. № 162-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1259) <H10600162>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 300-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1397) <H10700300>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398) <H10700301>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 317-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1414) <H10800317>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 397-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 175, 2/1494) <H10800397>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2009 г. № 114-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 15, 2/1666) <H10900114>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 109-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 17, 2/1661) <H11000109>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. № 266-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 60, 2/1818) <H11100266>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 130-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.01.2014, 2/2128) <H11400130>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2014 г. № 228-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 09.01.2015, 2/2226) <H11400228>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2015 г. № 242-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.01.2015, 2/2240) <H11500242>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 134-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2572) <H11800134>

ЗМЕСТ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе
Артыкул 2. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса
Артыкул 3. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул 4. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 5. Суб'екты адносін у галіне ўнутранага воднага транспарту
ГЛАВА 2. ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГАЛІНЕ ЎНУТРАНАГА ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ
Артыкул 6. Асновы дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці ў галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул 7. Органы дзяржаўнага рэгулявання ў галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул $7^1$. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул 8. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул 9. Паўнамоцтвы рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту
Артыкул $9^1$. Паўнамоцтвы рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь
Артыкул 10. Пацвярджэнне адпаведнасці транспартных работ і паслуг у галіне ўнутранага воднага транспарту патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі
Артыкул 11. Тарыфы на ўнутраным водным транспарце
ГЛАВА 3. УНУТРАНЫЯ ВОДНЫЯ ШЛЯХІ
Артыкул 12. Уласнасць на ўнутраных водных шляхах
Артыкул 13. Утрыманне ўнутраных водных шляхоў і суднаходных гідратэхнічных збудаванняў
Артыкул 14. Будаўніцтва і эксплуатацыя збудаванняў на ўнутраных водных шляхах
Артыкул 15. Умовы карыстання акваторыямі і землямі
Артыкул 16. Пакрыццё шкоды, прычыненай аб'ектам арганізацый унутранага воднага транспарту
ГЛАВА 4. ПАРТЫ
Артыкул 17. Агульныя палажэнні аб партах
Артыкул 18. Тэрыторыя порта
Артыкул 19. Дзяржаўная адміністрацыя порта
Артыкул 20. Асноўныя патрабаванні да эксплуатацыі порта
Артыкул 21. Рэжым работы порта
Артыкул 22. Партовыя выплаты
ГЛАВА $4^1$. БАЗЫ (ЗБУДАВАННІ) ДЛЯ СТАЯНАК МАЛАМЕРНЫХ СУДНАЎ
Артыкул $22^1$. Базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў

Артыкул $22^{2}$. Рэгістрацыя баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў
ГЛАВА 5. ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ НА СУДНА. ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ СУДНА І ПРАЎ НА ЯГО
Артыкул 23. Права ўласнасці на судна
Артыкул 24. Перадача судна ў давернае кіраванне
Артыкул 25. Права на іпатэку (заклад) суднаў
Артыкул 26. Арышт і прымусовы продаж судна
Артыкул 27. Безгаспадарныя судны
Артыкул 28. Сродкі ідэнтыфікацыі судна
Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя суднаў і праў на іх
Артыкул 30. Рэестры суднаў
Артыкул 31. Органы, якія ажыццяўляюць дзяржаўную рэгістрацыю суднаў
Артыкул 32. Умовы дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў
Артыкул 33. Парадак ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў
Артыкул 34. Рэгістрацыя змяненняў звестак, якія ўносяцца ў рэестры суднаў
Артыкул 35. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў
Артыкул 36. Выключэнне судна з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі
Артыкул 37. Права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь
Артыкул $37^{1}$. Класіфікацыя маламерных суднаў
Артыкул 38. Суднавыя дакументы
Артыкул 39. Парадак вядзення суднавага журнала
ГЛАВА 6. ЭКІПАЖ СУДНА
Артыкул 40. Састаў экіпажа судна
Артыкул 41. Патрабаванні да членаў экіпажа судна
Артыкул 42. Працоўныя адносіны на судне
Артыкул 43. Асабістая маёмасць членаў экіпажа судна
Артыкул 44. Рэпатрыяцыя членаў экіпажа судна
Артыкул 45. Паўнамоцтвы капітана (камандзіра) судна
Артыкул 46. Правы і абавязкі капітана (камандзіра) судна па падтрыманні парадку на судне
Артыкул 47. Абавязкі капітана (камандзіра) судна па аказанні дапамогі
Артыкул 48. Абавязкі капітана (камандзіра) судна ў выпадках нараджэння дзіцяці або смерці на судне
ГЛАВА $6^{1}$. КІРАВАННЕ МАЛАМЕРНЫМ СУДНАМ, ЯГО ЭКІПАЖ
Артыкул $48^{1}$. Кіраванне маламерным суднам, састаў экіпажа маламернага судна
Артыкул $48^{2}$. Патрабаванні да суднавадзіцеляў
Артыкул $48^{3}$. Паўнамоцтвы суднавадзіцеля
ГЛАВА 7. АРЭНДА (ФРАХТАВАННЕ НА ЧАС) СУДНА З ЭКІПАЖАМ
Артыкул 49. Дагавор арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам
Артыкул 50. Субарэнда судна з экіпажам
Артыкул 51. Абавязкі суднаўладальніка (арэндадаўца) па ўтрыманні судна, кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі
Артыкул 52. Абавязкі фрахтавальніка (арандатара) па камерцыйнай эксплуатацыі і звароце судна

Артыкул 53. Выключаны
Артыкул 54. Падпарадкаванасць экіпажа судна
Артыкул 55. Выплата фрахту
Артыкул 56. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі
Артыкул 57. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) перад трэцімі асобамі
Артыкул 58. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна
ГЛАВА 8. АРЭНДА СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА
Артыкул 59. Дагавор арэнды судна без экіпажа
Артыкул 60. Субарэнда судна без экіпажа
Артыкул 61. Абавязак арэндадаўца па прывядзенні судна ў суднаходны стан
Артыкул 62. Абавязкі арандатара па ўтрыманні судна, кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі
Артыкул 63. Экіпаж судна
Артыкул 64. Плата па дагаворы арэнды судна без экіпажа
Артыкул 65. Правы і абавязкі арандатара па эксплуатацыі і звароце судна
Артыкул 66. Адказнасць арандатара перад трэцімі асобамі
Артыкул 67. Адказнасць арандатара за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна
ГЛАВА 9. ПЕРАВОЗКА ГРУЗАЎ УНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ
Артыкул 68. Агульныя ўмовы перавозкі грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 69. Дагавор перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам
Артыкул 70. Дагавор аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 71. Прад'яўленне і прыём грузу да перавозкі ўнутраным водным транспартам
Артыкул 72. Вызначэнне масы грузаў
Артыкул 73. Патрабаванні да суднаў і кантэйнераў
Артыкул 74. Размяшчэнне і мацаванне грузаў на суднах
Артыкул 75. Падача транспартных сродкаў, пагрузка і выгрузка грузу
Артыкул 76. Пламбаванне суднаў і кантэйнераў
Артыкул 77. Правазная плата і выплаты за перавозку грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 78. Тэрміны дастаўкі грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 79. Абмежаванне або спыненне перавозкі грузаў
Артыкул 80. Права распараджэння грузам
Артыкул 81. Груз, пагружаны без ведама перавозчыка
Артыкул 82. Захоўванне і выдача грузу грузаатрымальніку
Артыкул 83. Праверка грузу пры выдачы
Артыкул 84. Ачыстка суднаў
Артыкул 85. Незапатрабаваны груз
Артыкул 86. Асаблівыя ўмовы перавозкі грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 87. Наступствы немагчымасці дастаўкі грузу
Артыкул 88. Перавозка небяспечных грузаў унутраным водным транспартам
Артыкул 89. Выключаны
Артыкул 90. Перавозкі воінскіх грузаў унутраным водным транспартам

Артыкул 91. Перавозкі грузаў у змешаных зносінах
Артыкул 92. выключаны
ГЛАВА 10. БУКСІРОЎКА СУДНАЎ, ПЛЫТОЎ І ІНШЫХ ПЛЫВУЧЫХ АБ'ЕКТАЎ
Артыкул 93. Дагавор буксіроўкі ўнутраным водным транспартам
Артыкул 94. Прад'яўленне буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў да буксіроўкі
Артыкул 95. Абавязкі адпраўшчыка плытоў
Артыкул 96. Прыём суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў да буксіроўкі
Артыкул 97. Ліквідацыя наступстваў транспартных аварыйных выпадкаў з буксаванымі суднамі, плытамі і іншымі плывучымі аб'ектамі
Артыкул 98. Здача буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў у пункце прызначэння
Артыкул 99. Захоўванне і адстой буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў пасля сканчэння тэрмінаў іх абавязковага прыёму да буксіроўкі
ГЛАВА 11. ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ І БАГАЖУ ЎНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ
Артыкул 100. Агульныя ўмовы перавозкі пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам
Артыкул 101. Дагавор перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам
Артыкул 102. Перавозка пасажыраў унутраным водным транспартам агульнага карыстання
Артыкул 103. Дагавор аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам
Артыкул 104. Правазная плата
Артыкул 105. Выключаны
Артыкул 106. Абавязкі і правы перавозчыка
Артыкул 107. Правы і абавязкі пасажыра
Артыкул 108. Выключаны
Артыкул 109. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам
Артыкул 110. Незапатрабаваны багаж
ГЛАВА 12. АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, БУКСІРОЎШЧЫКА, ГРУЗААДПРАЎШЧЫКА, ГРУЗААТРЫМАЛЬНІКА І ПАСАЖЫРА ПРЫ ПЕРАВОЗКАХ УНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ
Артыкул 111. Адказнасць па абавязацельствах пры перавозцы ўнутраным водным транспартам
Артыкул 112. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю або здароўю пасажыра
Артыкул 113. Адказнасць перавозчыка за затрымку адпраўлення або спазненне прыбыцця пасажырскага судна ў пункт прызначэння
Артыкул 114. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за пратэрміноўку дастаўкі грузу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта

Артыкул 115. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за непадачу суднаў і кантэйнераў. Адказнасць грузаадпраўшчыка за невыкарыстанне пададзеных суднаў
Артыкул 116. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за захаванасць грузу, багажу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта
Артыкул 117. Пакрыццё ўрону за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) грузу, багажу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта
Артыкул 118. Вызваленне перавозчыка (буксіроўшчыка) і грузаадпраўшчыка ад адказнасці
Артыкул 119. Адказнасць грузаадпраўшчыка і грузаатрымальніка пры перавозках унутраным водным транспартам
Артыкул 120. Адказнасць за шкоду ад забруджвання з судна нафтай або іншымі рэчывамі
Артыкул 121. Адказнасць пасажыра пры перавозцы ўнутраным водным транспартам
ГЛАВА 13. БЯСПЕКА СУДНАХОДСТВА СУДНАЎ УНУТРАНАГА ПЛАВАННЯ, СУДНАЎ ЗМЕШАНАГА (РАКА – МОРА) ПЛАВАННЯ
Артыкул 122. Агульныя палажэнні па бяспецы суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання
Артыкул 123. Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання
Артыкул 124. Кантроль за бяспекай суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь
Артыкул 125. Дзяржаўны пажарны нагляд і кантроль за станам пажарнай бяспекі
Артыкул 126. Забеспячэнне экалагічнай бяспекі суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання. Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва
Артыкул 127. Лоцманская праводка суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання
Артыкул 128. Затанулая маёмасць
Артыкул 129. Пад’ём затанулай маёмасці
Артыкул 130. Пакрыццё шкоды, прычыненай сутыкненнем суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання
ГЛАВА 13$^{1}$. БЯСПЕКА СУДНАХОДСТВА МАЛАМЕРНЫХ СУДНАЎ. ЭКСПЛУАТАЦЫЯ ГЭТЫХ СУДНАЎ І БАЗ (ЗБУДАВАННЯЎ) ДЛЯ ІХ СТАЯНАК
Артыкул 130$^{1}$. Бяспека суднаходства маламерных суднаў, бяспечная эксплуатацыя гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак
Артыкул 130$^{2}$. Тэхнічны агляд маламерных суднаў
Артыкул 130$^{3}$. Забарона на эксплуатацыю маламернага судна, базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў
Артыкул 130$^{4}$. Затанулае маламернае судна
Артыкул 130$^{5}$. Правы і абавязкі службовых асоб Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах

Артыкул 130[6]. Садзейнічанне грамадзян у забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак
Артыкул 130[7]. Правы і абавязкі пазаштатных супрацоўнікаў Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах
Артыкул 130[8]. Забеспячэнне экалагічнай бяспекі суднаходства маламерных суднаў і эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак. Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва
Артыкул 130[9]. Лоцманская праводка маламерных суднаў
Артыкул 130[10]. Пакрыццё шкоды, прычыненай сутыкненнем маламернага судна з іншым суднам
ГЛАВА 14. АГУЛЬНАЯ АВАРЫЯ
Артыкул 131. Паняцце агульнай аварыі
Артыкул 132. Прымяненне правіл, устаноўленых гэтай главой
Артыкул 133. Заменныя выдаткі
Артыкул 134. Выключэнне ўскосных страт
Артыкул 135. Цяжар доказвання
Артыкул 136. Пакрыццё выдаткаў на ратаванне
Артыкул 137. Частковая выгрузка грузу з аднаго судна і пагрузка яго на іншае судна
Артыкул 138. Месца сховішча
Артыкул 139. Караван суднаў
Артыкул 140. Агульная аварыя, выкліканая пашкоджаннем машын, наўмыснай пасадкай на мель, падыманнем затанулага судна і пажарам на судне
Артыкул 141. Страты ад пашкоджання судна, яго машын і прылад  або гібелі судна
Артыкул 142. Страты ад гібелі або пашкоджання грузу
Артыкул 143. Страты ад згубы правазной платы
Артыкул 144. Працэнты на страты, якія кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі
Артыкул 145. Кантрыбуцыйны кошт маёмасці
Артыкул 146. Дыспаша і дыспашэры
Артыкул 147. Матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша
Артыкул 148. Плата за складанне дыспашы
Артыкул 149. Выпраўленне і аспрэчванне дыспашы
Артыкул 150. Выкананне дыспашы
ГЛАВА 15. РАТАВАННЕ ЛЮДЗЕЙ, СУДНАЎ І ІНШАЙ МАЁМАСЦІ
Артыкул 151. Агульныя палажэнні аб ратаванні людзей, суднаў і іншай маёмасці
Артыкул 152. Дагаворы аб ратаванні
Артыкул 153.Выдаткі асобы, якая аказала дапамогу, і спецыяльная кампенсацыя
Артыкул 154. Умовы выплаты ўзнагароджання за выратавальныя аперацыі
Артыкул 155. Размеркаванне ўзнагароджання за выратавальную аперацыю паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна
Артыкул 156. Ратаванне людзей
Артыкул 157. Забеспячэнне выканання абавязацельстваў па ратаванні

Артыкул 158. Размеркаванне страт пры ратаванні
ГЛАВА 16. КАМЕРЦЫЙНЫЯ АКТЫ, АКТЫ АГУЛЬНАЙ ФОРМЫ, ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ
Артыкул 159. Камерцыйныя акты, акты агульнай формы
Артыкул 160. Парадак прад'яўлення прэтэнзій
Артыкул 161. Права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў
Артыкул 162. Тэрміны разгляду прэтэнзій
Артыкул 163. Тэрміны іскавай даўнасці
Артыкул 164. Прымяненне агульных тэрмінаў іскавай даўнасці
ГЛАВА 17. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 165. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 166. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам

Гэты Кодэкс устанаўлівае прававыя, эканамічныя і арганізацыйныя асновы суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе

Для мэт гэтага Кодэкса прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

акваторыя порта – адасоблены ўчастак унутранага воднага шляху, які выкарыстоўваецца для забеспячэння дзейнасці порта;

багаж – маёмасць, здадзеная перавозчыку пасажырам, якую перавозчык абавязаны даставіць у пункт прызначэння і на падставе багажнай квітанцыі выдаць;

база (збудаванне) для стаянкі маламерных суднаў – комплекс аб'ектаў (аб'ект) на сухапутнай тэрыторыі і акваторыі, прызначаны для стаянкі (захоўвання) і (або) абслугоўвання 10 і болей маламерных суднаў, за выключэннем партоў і суднаходных гідратэхнічных збудаванняў;

унутраныя водныя шляхі – натуральныя або штучна створаныя ўчасткі вадаёмаў і вадатокаў, якія пазначаны навігацыйнымі знакамі або іншым спосабам і якія выкарыстоўваюцца ў мэтах суднаходства;

унутраны водны транспарт – від транспарту, на якім перавозкі пасажыраў, грузаў і багажу выконваюцца на ўнутраных водных шляхах з выкарыстаннем суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, а таксама які выкарыстоўваецца ў мэтах суднаходства з удзелам маламерных суднаў;

унутраны водны транспарт агульнага карыстання – унутраны водны транспарт, які выконвае перавозкі пасажыраў, грузаў і багажу на падставе публічнага дагавора, гэта значыць па звароце любой асобы і згодна з рэгуляванымі або аб'яўленымі тарыфамі;

грузаўладальнік – грузаадпраўшчык і (або) грузаатрымальнік;

грузаадпраўшчык – юрыдычная або фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, якія ад свайго імені або на падставе дагавора перавозкі ўнутраным водным транспартам давяраюць перавозчыку груз для яго дастаўкі ў пункт прызначэння і выдачы грузаатрымальніку;

грузаатрымальнік – юрыдычная або фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, упаўнаважаныя на атрыманне грузу на падставе дагавора перавозкі ўнутраным водным транспартам або на іншых законных падставах;

грузы – матэрыяльныя каштоўнасці, прынятыя перавозчыкам для перавозак унутраным водным транспартам у пункт прызначэння;

канасамент – таварараспарадчы дакумент (каштоўная папера), які сведчыць заключэнне дагавора перавозкі грузу або дагавора буксіроўкі ўнутраным водным транспартам і з'яўляецца доказам прыёму перавозчыкам указанага ў гэтым дакуменце грузу;

лоцманская праводка – дзейнасць, якая забяспечвае бяспечнае праходжанне суднаў на асабліва складаных участках унутраных водных шляхоў;

маламерныя судны – судны даўжынёй не больш за 20 метраў з дапушчальнай колькасцю людзей на борце не больш за 12 чалавек, у тым ліку судны з падвеснымі рухавікамі і гідрацыклы, за выключэннем пабудаваных або абсталяваных для промыславага рыбалоўства, аказання паслуг перавозкі грузаў і (або) пасажыраў, буксіроўкі, правядзення пошуку, разведкі і здабычы карысных выкапняў, будаўнічых пуцявых, гідратэхнічных і іншых падобных работ, лоцманскай і ледакольнай праводкі, ажыццяўлення мерапрыемстваў для аховы паверхневых водных аб'ектаў ад забруджванняў і засмечванняў, а таксама прыналежных арганізацыям унутранага воднага транспарту Рэспублікі Беларусь, ваенных, ваенна-дапаможных, пагранічных і іншых суднаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і эксплуатуюцца выключна ў некамерцыйных мэтах;

навігацыйнае абсталяванне – сістэма спецыяльных сігнальных сродкаў, прызначаных для забеспячэння бяспечнага суднаходства;

навігацыя – перыяд часу, на працягу якога ўнутраныя водныя шляхі адкрыты для суднаходства;

пасажыр – фізічная асоба, якая мае праязны дакумент (білет), які сведчыць аб заключэнні дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам, або якая перавозіцца суднам унутранага плавання на іншых законных падставах;

перавозчык – юрыдычная або фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, якія выконваюць на падставе дагавора перавозкі або на іншых законных падставах дастаўку пасажыраў, грузаў, багажу, а таксама плывучых аб'ектаў у пункт прызначэння;

плывучы аб'ект – плывучае штучнае збудаванне, якое не з'яўляецца суднам і якое не выкарыстоўваецца ў мэтах суднаходства;

порт – спецыяльна адведзены ўчастак сухапутнай тэрыторыі і акваторыі ўнутраных водных шляхоў, прызначаны для абслугоўвання пасажыраў і суднаў, прыёму, пагрузкі, выгрузкі, захоўвання і выдачы грузаў і багажу, а таксама выканання іншых работ і паслуг, якія звычайна аказваюцца ў порце;

порт агульнага карыстання – порт, які ажыццяўляе прыём, пагрузку, выгрузку, захоўванне і выдачу грузаў і багажу на падставе публічнага дагавора, гэта значыць па звароце любой асобы і згодна з рэгуляванымі або аб'яўленымі тарыфамі;

пуцявыя работы – днопаглыбныя, папраўчыя, тральныя, дноачышчальныя, вышукальныя работы, а таксама ўтрыманне навігацыйнага абсталявання на ўнутраных водных шляхах;

ручная паклажа – рэчы і прадметы пасажыра, якія з-за сваіх уласцівасцей, габарытных памераў і масы адпавядаюць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь і перавозяцца бясплатна пад асабістую адказнасць пасажыра;

судна – самаходнае або несамаходнае плывучае штучнае збудаванне, якое выкарыстоўваецца ў мэтах суднаходства;

судна ўнутранага плавання – судна, якое па сваіх тэхнічных характарыстыках прыдатна і дапушчана да эксплуатацыі на ўнутраных водных шляхах, за выключэннем маламернага судна;

судна змешанага (рака – мора) плавання – судна, якое з-за сваіх тэхнічных характарыстык прыгодна і дапушчана да эксплуатацыі на марскіх і ўнутраных водных шляхах, за выключэннем маламернага судна;

суднаўладальнік – юрыдычная або фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, якія эксплуатуюць судна ад свайго імені незалежна ад таго, з'яўляюцца яны ўласнікамі судна або выкарыстоўваюць яго на іншай законнай падставе;

суднавадзіцель маламернага судна (далей – суднавадзіцель) – фізічная асоба, якая кіруе маламерным суднам, за выключэннем асобы, якая навучаецца кіраванню маторным маламерным суднам, магутнасць рухавіка якога перавышае 3,7 кілаваты (5 конскіх сіл) (далей – маторнае маламернае судна), або якая здае практычны экзамен на права кіравання маторным маламерным суднам. Да суднавадзіцеля прыраўноўваецца асоба, якая навучае кіраванню маторным маламерным суднам або якая прымае практычны экзамен на права кіравання маторным маламерным суднам і пры гэтым знаходзіцца на ім;

суднавы білет – дакумент, які пацвярджае права ўласнасці (гаспадарчага вядзення, аператыўнага кіравання) на маламернае судна і права плавання гэтага судна пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь;

суднавы ход – прастора на ўнутраным водным шляху, прызначаная для руху суднаў і пазначаная на мясцовасці і (або) на карце;

суднаходныя гідратэхнічныя збудаванні – збудаванні на ўнутраных водных шляхах, прызначаныя для забеспячэння суднаходства;

суднаходства – дзейнасць, звязаная з выкарыстаннем на ўнутраных водных шляхах суднаў для перавозкі пасажыраў, грузаў, багажу, паштовых адпраўленняў, буксіроўкі суднаў і іншых плывучых аб'ектаў, правядзення пошукаў, разведкі і здабычы карысных выкапняў, будаўнічых, пуцявых, гідратэхнічных, падводна-тэхнічных і іншых падобных работ, лоцманскай праводкі, выратавальных аперацый, ажыццяўлення мерапрыемстваў для аховы паверхневых водных аб'ектаў ад забруджвання і засмечвання, а таксама для пад’ёму затанулай маёмасці, санітарнага і іншага кантролю, правядзення навуковых даследаванняў, навучальных, спартыўных, культурных і іншых мэт;

транспартны аварыйны выпадак – аварыйны выпадак, звязаны з рухам суднаў (судна).

**Артыкул 2. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс рэгулюе адносіны, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, вызначае асноўныя правы, абавязкі і адказнасць суб'ектаў адносін у галіне ўнутранага воднага транспарту.

Правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам, распаўсюджваюцца на:

унутраныя водныя шляхі Рэспублікі Беларусь і размешчаныя на іх збудаванні;

парты, прыстані, прычалы, базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў, размешчаныя на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання, маламерныя судны і іншыя плывучыя аб'екты, якія эксплуатуюцца на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь.

Дзеянне гэтага Кодэкса, за выключэннем спецыяльна ў ім прадугледжаных выпадкаў, не распаўсюджваецца на ваенныя, ваенна-дапаможныя, пагранічныя і іншыя судны, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і эксплуатуюцца або выкарыстоўваюцца выключна ў некамерцыйных мэтах.

### Артыкул 3. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць адносіны ў гэтай галіне.

### Артыкул 4. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у сілу, устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Кодэксе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 5. Суб'екты адносін у галіне ўнутранага воднага транспарту

Суб'ектамі адносін у галіне ўнутранага воднага транспарту з'яўляюцца Рэспубліка Беларусь у асобе ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржавы, юрыдычныя асобы, уключаючы замежныя і міжнародныя юрыдычныя асобы, арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у гэтай галіне.

## ГЛАВА 2
## ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГАЛІНЕ УНУТРАНАГА ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ

### Артыкул 6. Асновы дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці ў галіне ўнутранага воднага транспарту

Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне ўнутранага воднага транспарту ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння патрэб эканомікі і насельніцтва ў перавозках на ўнутраных водных шляхах, забеспячэння бяспекі суднаходства і стварэння ўмоў, неабходных для развіцця рынку транспартных работ і паслуг.

Дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне ўнутранага воднага транспарту ўключае:

вызначэнне і рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўнутранага воднага транспарту;

прыняцце (выданне) нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць у галіне ўнутранага воднага транспарту;

заключэнне міжнародных дагавораў у галіне ўнутранага воднага транспарту;

распрацоўку і рэалізацыю праграм развіцця і выкарыстання ўнутранага воднага транспарту;

правядзенне тарыфнай палітыкі ў галіне ўнутранага воднага транспарту;

пацвярджэнне адпаведнасці транспартных работ і паслуг у галіне ўнутранага воднага транспарту патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі;

устанаўленне патрабаванняў па забеспячэнні бяспекі дзейнасці ў галіне ўнутранага воднага транспарту і аховы навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 7. Органы дзяржаўнага рэгулявання ў галіне ўнутранага воднага транспарту**

Дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне ўнутранага воднага транспарту ажыццяўляюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту, рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, які рэгулюе сферу бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, і іншыя органы дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул $7^1$. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту вызначае адзіную дзяржаўную палітыку, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 8. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту**

Урад Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранага воднага транспарту:

зацвярджае праграмы развіцця і выкарыстання ўнутранага воднага транспарту;

вызначае, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, кампетэнцыю органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўную рэгістрацыю суднаў, кантроль за бяспекай суднаходства, тэхнічны нагляд за суднамі, іх класіфікацыю;

устанаўлівае парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і класіфікацыі, тэхнічнага агляду маламерных суднаў, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю меншай за 225 кілаграмаў, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

устанаўлівае парадак навучання і праверкі ведаў грамадзянамі правіл кіравання маторнымі маламернымі суднамі;

зацвярджае Правілы карыстання маламернымі суднамі і базамі (збудаваннямі) для іх стаянак;

зацвярджае Правілы дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання;

зацвярджае пералік партоў, зачыненых для заходу і абслугоўвання замежных суднаў;

устанаўлівае парадак арганізацыі і выканання перавозак воінскіх грузаў унутраным водным транспартам;

ажыццяўляе міжурадавае супрацоўніцтва ў галіне ўнутранага воднага транспарту;

вырашае іншыя пытанні ў галіне ўнутранага воднага транспарту ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9. Паўнамоцтвы рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту**

Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту:

арганізуе распрацоўку і рэалізацыю праграм развіцця і выкарыстання ўнутранага воднага транспарту, за выключэннем маламерных суднаў;

праводзіць эканамічную, навукова-тэхнічную і сацыяльную палітыку ў галіне ўнутранага воднага транспарту, за выключэннем маламерных суднаў;

зацвярджае Правілы перавозак пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам (далей – Правілы перавозак пасажыраў і багажу), Правілы перавозак грузаў унутраным водным транспартам (далей – Правілы перавозак грузаў), Правілы буксіроўкі суднаў, плытоў і плывучых аб'ектаў (далей – Правілы буксіроўкі);

зацвярджае Правілы прадухілення забруджвання ўнутраных водных шляхоў сцёкавымі і нафтазмяшчальнымі водамі з суднаў;

зацвярджае Правілы тэхнічнай эксплуатацыі суднаходных гідратэхнічных збудаванняў;

устанаўлівае парадак публікацыі пералікаў арганізацый, якія адносяцца да ўнутранага воднага транспарту агульнага карыстання;

устанаўлівае парадак спагнання партовых выплат;

зацвярджае Правілы плавання па ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае парадак арганізацыі лоцманскай праводкі;

устанаўлівае пералік і межы ўнутраных водных шляхоў Рэспублікі Беларусь, адкрытых для суднаходства, пасля ўзгаднення з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

зацвярджае Статут службы на суднах унутранага воднага транспарту, Палажэнне аб дыпламаванні і атэстацыі плаўсастава суднаў, якія эксплуатуюцца на ўнутраных водных шляхах, за выключэннем маламерных суднаў, Палажэнне аб мінімальным саставе экіпажаў самаходных транспартных суднаў, за выключэннем маламерных суднаў;

устанаўлівае катэгорыю сродкаў навігацыйнага абсталявання і тэрміны яго дзеяння;

устанаўлівае гарантаваныя габарыты суднавых хадоў, а таксама тэрміны работы шлюзаў;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9[1]. Паўнамоцтвы рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь**

Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь:

забяспечвае кантроль за бяспекай суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, а таксама за эксплуатацыяй гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

устанаўлівае патрабаванні да эксплуатацыйнага стану маламерных суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

вызначае класіфікацыю транспартных аварыйных выпадкаў з удзелам маламерных суднаў, парадак іх расследавання;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10. Пацвярджэнне адпаведнасці транспартных работ і паслуг у галіне ўнутранага воднага транспарту патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі**

Пацвярджэнне адпаведнасці транспартных работ і паслуг у галіне ўнутранага воднага транспарту патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11. Тарыфы на ўнутраным водным транспарце**

Тарыфы на перавозку па ўнутраных водных шляхах пасажыраў, грузаў, багажу, буксіроўку суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў, а таксама тарыфы на іншыя работы і паслугі ўнутранага воднага транспарту ўстанаўліваюцца ў парадку, які вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## УНУТРАНЫЯ ВОДНЫЯ ШЛЯХІ

**Артыкул 12. Уласнасць на ўнутраных водных шляхах**

Унутраныя водныя шляхі складаюць выключную ўласнасць дзяржавы. Рэкі, азёры, вадасховішчы, каналы і іншыя паверхневыя водныя аб'екты з'яўляюцца ўнутранымі воднымі шляхамі агульнага карыстання, за выключэннем выпадкаў, калі іх выкарыстанне ў мэтах суднаходства поўнасцю або часткова забаронена або яны дадзены ў адасобленае водакарыстанне.

Ва ўласнасці юрыдычных або фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, могуць знаходзіцца штучныя збудаванні на ўнутраных водных шляхах, не аднесеныя законамі Рэспублікі Беларусь да аб'ектаў, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

Штучныя збудаванні на ўнутраных водных шляхах, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы, за выключэннем збудаванняў для рэгулявання ўзроўню вады, а таксама збудаванняў, якія выкарыстоўваюцца для пераходу суднаў з аднаго воднага басейна ў іншы з рознымі ўзроўнямі вады ў іх, для выканання абавязацельстваў, прадугледжаных пагадненнем аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, могуць перадавацца прыватнаму партнёру ў валоданне, карыстанне, у тым ліку ў бязвыплатнае карыстанне. Пры гэтым тэрмін «прыватны партнёр» выкарыстоўваецца ў значэнні, вызначаным пунктам 1 артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 года «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве» (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2340).

Размешчаныя на ўнутраных водных шляхах суднаходныя гідратэхнічныя збудаванні прызначаны для выкарыстання любымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі. За праход суднаў па шлюзаванай сістэме могуць устанаўлівацца выплаты за шлюзаванне. Памер выплат за

шлюзаванне суднаў, а таксама парадак іх спагнання вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 13. Утрыманне ўнутраных водных шляхоў і суднаходных гідратэхнічных збудаванняў**

Пуцявыя работы, у тым ліку ўстройванне і ўтрыманне рэйдаў у партах агульнага карыстання, і ўтрыманне суднаходных гідратэхнічных збудаванняў у мэтах забеспячэння бяспечнага суднаходства ажыццяўляюцца рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў за кошт рэспубліканскага бюджэту ў межах сродкаў, якія вызначаюцца для гэтых мэт законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

Пуцявыя работы могуць выконвацца таксама за кошт даходаў ад гаспадарчай дзейнасці рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў унутраных водных шляхоў і за кошт іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пуцявыя работы, ўстройванне і ўтрыманне навігацыйнага абсталявання на падыходах і каля прычалаў партоў, у затоках ажыццяўляюцца за кошт сродкаў асоб, ва ўласнасці або карыстанні якіх яны знаходзяцца.

Днопаглыбныя і папраўчыя работы, за выключэннем неадкладных, выконваюцца пасля ўзгаднення з тэрытарыяльнымі органамі дзяржаўнага кіравання па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя.

Неадкладныя днопаглыбныя і папраўчыя работы на ўнутраных водных шляхах выконваюцца рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў з захоўваннем законных праў і інтарэсаў іншых водакарыстальнікаў і неадкладным паведамленнем аб гэтым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, тэрытарыяльным органам дзяржаўнага кіравання па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 14. Будаўніцтва і эксплуатацыя збудаванняў на ўнутраных водных шляхах**

Будаўніцтва і эксплуатацыя збудаванняў на ўнутраных водных шляхах (мастоў, прычалаў, дамб, плацін, каналаў, надводных і падводных пераходаў, водазабораў, вадаспускаў, бом, заток, ліній электрычнай сувязі і перадачы і інш.), беззваротнае здабыванне нярудных будаўнічых матэрыялаў ажыццяўляюцца пасля ўзгаднення з рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў, тэрытарыяльнымі органамі дзяржаўнага кіравання па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя і іншымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Уладальнікі збудаванняў на ўнутраных водных шляхах абавязаны за кошт уласных сродкаў ставіць навігацыйныя знакі і забяспечваць іх дзеянне ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі пасля ўзгаднення з рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў.

Уладальнікі разводных і пад'ёмных мастоў абавязаны разводзіць і падымаць іх адпаведна графіку, узгодненаму з рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў.

Уладальнікі мастоў абавязаны за кошт уласных сродкаў ставіць і ўтрымліваць прылады і прыстасаванні, неабходныя для бяспечнага праходу суднаў і плытоў, а таксама выконваць днопаглыбныя і дноачышчальныя работы пасля пабудовы і рамонту мастоў.

Уладальнікі гідраэлектрастанцый і іншых водападпорных збудаванняў абавязаны падтрымліваць неабходныя для суднаходства ўзроўні вады, узгодненыя з рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту, на ўчастках вышэй і ніжэй гэтых збудаванняў.

Эксплуатацыя гідравузлоў і вадасховішчаў комплекснага прызначэння, рэгуляванне ў іх узроўняў вады ажыццяўляюцца пасля ўзгаднення з рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

**Артыкул 15. Умовы карыстання акваторыямі і землямі**

Для выканання работ, звязаных з суднаходствам, на ўнутраных водных шляхах па-за населенымі пунктамі арганізацыям унутранага воднага транспарту даецца ў пастаяннае карыстанне паласа адводу зямлі (берагавая паласа) шырынёй 20 метраў ад урэзку вады або ад броўкі берага (на крутых берагах) у глыб мацерыка або вострава.

У пастаяннае карыстанне рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам унутраных водных шляхоў даюцца зямельныя ўчасткі, якія заняты будынкамі сацыяльнага і вытворчага прызначэння і збудаваннямі.

Рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы ўнутраных водных шляхоў маюць права:

карыстацца берагавой паласой для выканання работ для забеспячэння суднаходства;

ставіць на берагавой паласе навігацыйныя знакі;

рабіць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб выкарыстанні, ахове, абароне і ўзнаўленні лясоў і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні расліннага свету высечку, выдаленне, перасадку драўнінна-хмызняковай расліннасці, якая расце ў межах берагавой паласы, у мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства, бачнасці берагавых навігацыйных знакаў. Пры неабходнасці ўстаноўка берагавых навігацыйных знакаў, высечка, выдаленне, перасадка драўнінна-хмызняковай расліннасці ў мэтах забеспячэння бачнасці гэтых знакаў могуць праводзіцца за межамі берагавой паласы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

выкарыстоўваць бязвыплатна для выканання работ грунт, камень, гравій, а таксама драўнінна-хмызняковую расліннасць, якія знаходзяцца ў межах берагавой паласы.

Часовыя прыстасаванні для прычальвання, швартоўкі і стаянкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, пагрузкі, выгрузкі і захоўвання грузаў, пасадкі і высадкі пасажыраў будуюцца пасля ўзгаднення з рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў.

Устаноўка на берагавой паласе крыніц светлавога выпраменьвання без агароджвання іх з боку суднавага хода шчытамі, акрамя агнёў навігацыйнага абсталявання, забараняецца.

Карыстанне воднымі ўчасткамі для патрэб прамысловага рыбалоўства ў месцах, дзе яны выкарыстоўваюцца для патрэб суднаходства, дапускаецца пасля ўзгаднення з рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту і іншымі органамі дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Права карыстання берагавой паласой не распаўсюджваецца на паласу адводу чыгункі і іншыя ўчасткі зямлі, на якіх размешчаны прылады і збудаванні чыгуначнага транспарту, палосы адводу аўтамабільных дарог, на ахоўную зону надводных і

падводных пераходаў, участкі, умацаваныя спецыяльнымі збудаваннямі, і на іншыя землі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Даванне зямельных участкаў у зоне дзеяння навігацыйнага абсталявання і будоўля на іх якіх-небудзь збудаванняў ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, пасля ўзгаднення з рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі ўнутраных водных шляхоў.

Карыстанне берагавой паласой у межах унутраных водных шляхоў на ўчастках пагранічнай зоны Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і пасля ўзгаднення з Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь.

Асобы, якія выкарыстоўваюць берагавую паласу для выканання часовых работ, пасля іх заканчэння абавязаны ачысціць і добраўпарадкаваць яе.

**Артыкул 16. Пакрыццё шкоды, прычыненай аб'ектам арганізацый унутранага воднага транспарту**

Асобы, якія прычынілі шкоду суднаваму ходу, а таксама навігацыйнаму абсталяванню, суднаходным гідратэхнічным збудаванням і іншым аб'ектам арганізацый унутранага воднага транспарту або якія знішчылі такія аб'екты, абавязаны кампенсаваць прычыненую шкоду ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## ПАРТЫ

**Артыкул 17. Агульныя палажэнні аб партах**

Маёмасць порта можа знаходзіцца ў дзяржаўнай або прыватнай уласнасці.

Пералік партоў з указаннем партоў агульнага карыстання, відаў аперацый, якія выконваюцца імі, тарыфных адлегласцей паміж імі і тэрмінаў навігацыі публікуецца для агульнага ведама ў парадку, які ўстанаўліваецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Рашэнне аб зачыненні порта для заходу і абслугоўвання замежных суднаў прымаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 18. Тэрыторыя порта**

Тэрыторыя порта ўключае акваторыю порта і сухапутную тэрыторыю.

Сухапутную тэрыторыю порта складаюць землі, адведзеныя порту ў адпаведнасці з зямельным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Акваторыя порта адасабляецца ў адпаведнасці з водным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 19. Дзяржаўная адміністрацыя порта**

У мэтах дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці партоў па рашэнні рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту ў порце ствараецца дзяржаўная адміністрацыя порта. Дзяржаўная адміністрацыя порта з'яўляецца юрыдычнай асобай або яго адасобленым падраздзяленнем і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з палажэннем,

зацверджаным рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Асноўнымі абавязкамі дзяржаўнай адміністрацыі порта з'яўляюцца:

арганізацыя абслугоўвання пасажыраў;

арганізацыя выканання пагрузачна-разгрузачных работ;

забеспячэнне бяспекі суднаходства на акваторыі порта;

арганізацыя і выкананне работ у выпадку забруджвання акваторыі порта;

арганізацыя абыходжання з суднавымі адходамі;

спагнанне партовых выплат;

арганізацыя і выкананне работ для ратавання на акваторыі порта суднаў і ліквідацыі пажараў на суднах, якія знаходзяцца ў порце.

**Артыкул 20. Асноўныя патрабаванні да эксплуатацыі порта**

Уладальнікі прычалаў партоў павінны забяспечваць бяспечныя падыходы для суднаў, бяспечную стаянку суднаў каля прычалаў. У залежнасці ад прызначэння порта на прычалах павінны быць склады, вагавымяральныя прыборы, прылады і абсталяванне для перагрузкі грузаў, прылады для пасадкі, высадкі і знаходжання пасажыраў.

Перагрузачнае абсталяванне, якое эксплуатуецца ў партах, павінна адпавядаць патрабаванням Правіл тэхнічнай эксплуатацыі ўнутранага воднага транспарту, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту. Уладальніка порта кантралюе ўтрыманне, своечасовы рамонт гэтага абсталявання і бяспечнае выкананне работ.

Эксплуатацыя порта павінна ажыццяўляцца з захоўваннем прыродаахоўных, санітарных, супрацьпажарных і іншых патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Рэжым работы порта**

Для рэгулявання дзейнасці юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, на тэрыторыі порта, а таксама суднаў, якія знаходзяцца на яго акваторыі, дзяржаўная адміністрацыя порта пасля ўзгаднення з зацікаўленымі органамі і іншымі арганізацыямі вызначае:

парадак уваходу суднаў у порт і выхаду іх з порта;

правілы плавання суднаў на акваторыі порта і стаянкі іх у порце;

правілы забеспячэння бяспекі ў порце;

правілы карыстання сродкамі сувязі;

супрацьпажарны рэжым у порце;

парадак і ўмовы загрузкі, разгрузкі і абслугоўвання суднаў, якія знаходзяцца ў порце;

парадак і ўмовы дастаўкі ў порт і адпраўлення з порта грузаў чыгуначным, аўтамабільным або водным транспартам;

парадак і ўмовы захоўвання грузаў на складах порта;

парадак і ўмовы абслугоўвання пасажыраў, а таксама ажыццяўлення іншых відаў дзейнасці ў порце.

Пры ўстанаўленні ў порце пункта пропуску праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь пагранічны, санітарна-каранцінны і іншыя віды кантролю ажыццяўляюцца, а мытны кантроль праводзіцца

ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і (або) заканадаўствам Мытнага саюза.

**Артыкул 22. Партовыя выплаты**

У партах могуць устанаўлівацца наступныя партовыя выплаты з суднаў:

карабельная (суднавая);

канальная;

прычальная;

лоцманская;

якарная;

за прыём з суднаў у перапрацоўку нафтазмяшчальных і гаспадарча-бытавых вод і адходаў.

Памер партовых выплат вызначаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА $4^1$
## БАЗЫ (ЗБУДАВАННІ) ДЛЯ СТАЯНАК МАЛАМЕРНЫХ СУДНАЎ

**Артыкул $22^1$. Базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў**

Базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў могуць эксплуатавацца юрыдычнымі асобамі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі (далей – эксплуатант).

База (збудаванне) для стаянкі маламерных суднаў мае тэрыторыю, якая ўключае сухапутную тэрыторыю і акваторыю.

Маёмасць баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў можа знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці і (або) прыватнай уласнасці як іх эксплуатантаў, так і іншых юрыдычных або фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў. Карыстанне эксплуатантам маёмасцю баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці іншых юрыдычных або фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, ажыццяўляецца на праве арэнды або іншай законнай падставе.

Эксплуатацыя баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў дапускаецца пасля іх рэгістрацыі.

Эксплуатант базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў павінен забяспечваць яе адпаведнасць патрабаванням да эксплуатацыйнага стану баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, якія ўстанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, што ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, а таксама не дапускаць пагрозы тэхнічнага стану базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў бяспецы суднаходства, навакольнаму асяроддзю.

**Артыкул $22^2$. Рэгістрацыя баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў**

Базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў у мэтах іх уліку падлягаюць рэгістрацыі эксплуатантамі ў рэестры баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў. Рэгіструе базы (збудаванні) для стаянак маламерных суднаў і вядзе адпаведны рэестр дзяржаўная установа «Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах» (далей – Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах) у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах.

Форму рэестра баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў, звесткі, што падлягаюць унясенню ў рэестр баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў,

устанаўлівае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь.

У рэгістрацыі базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў можа быць адмоўлена ў выпадку неадпаведнасці базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў патрабаванням да эксплуатацыйнага стану баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах.

Змяненні ў рэестр баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў уносяцца пры змяненні звестак, якія падлягаюць унясенню ў рэестр баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў, у тым ліку пры змене эксплуатанта базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў.

Выключэнне базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў з рэестра баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў ажыццяўляецца пры спыненні яе эксплуатацыі.

Эксплуатант базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў у выпадках, прадугледжаных часткамі чацвёртай і пятай гэтага артыкула, абавязаны на працягу 14 каляндарных дзён з моманту надыходу адпаведнага выпадку звярнуцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах у Дзяржаўную інспекцыю па маламерных суднах для ўнясення змяненняў у рэестр баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў або выключэння такой базы (збудавання) з рэестра баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў адпаведна.

## ГЛАВА 5
## ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ НА СУДНА.
## ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ СУДНА І ПРАЎ НА ЯГО

### Артыкул 23. Права ўласнасці на судна

Судны могуць знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці або прыватнай уласнасці юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь і (або) грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў.

Права ўласнасці на судна, якое падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, або на долю ў ёй узнікае з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Права ўласнасці на судна, якое будуецца, або на долю ў ёй узнікае з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі такога права ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 24. Перадача судна ў давернае кіраванне

Уласнік судна мае права перадаць яго давернаму кіраўніку па дагаворы давернага кіравання суднам на тэрмін, які не перавышае пяць гадоў, для ажыццяўлення кіравання суднам за ўзнагароджанне ў інтарэсах уласніка.

Давернае кіраванне суднам можа быць таксама устаноўлена на іншых падставах, прадугледжаных грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Перадача судна ў давернае кіраванне падлягае абавязковай рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

**Артыкул 25. Права на іпатэку (заклад) суднаў**

Судна, зарэгістраванае ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе, а таксама судна, якое будуецца, права ўласнасці на якое зарэгістравана ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь, могуць быць закладзены з мэтай забеспячэння грашовага абавязацельства дагаворам уласніка судна або судна, якое будуецца (залогадавальніка), і крэдытора (залогатрымальніка) з наступнай рэгістрацыяй іпатэкі (закладу) у тым жа суднавым рэестры або суднавай кнізе, у якіх зарэгістраваны судна або права ўласнасці на судна, якое будуюцца.

Іпатэка (заклад) замежнага судна, у тым ліку судна, якому часова дадзена права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, а таксама судна, якое будуецца для замежнага заказчыка, не можа быць зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь.

Калі судна або судна, якое будуецца, знаходзяцца ў агульнай долевай уласнасці, то можа быць закладзена любая доля ў судне або судне, якое будуецца.

Судна або судна, якое будуецца, якія знаходзяцца ў агульнай сумеснай уласнасці, могуць быць закладзены са згоды ўсіх уласнікаў. Уласнік долі ў судне або судне, якое будуецца, мае права закласці сваю долю самастойна, але ўсё судна або судна, якое будуюцца, якія знаходзяцца ў агульнай долевай уласнасці, могуць быць закладзены са згоды ўсіх уласнікаў.

**Артыкул 26. Арышт і прымусовы продаж судна**

У выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, на судна або судна, якое будуюцца, можа быць накладзены арышт у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку арышту або прымусовага продажу судна або судна, якое будуецца, орган, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў, павінен унесці адпаведны запіс у Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, у якіх гэта судна было зарэгістравана.

Асоба, якая патрабуе ажыццяўлення мер, указаных у частцы другой гэтага артыкула, а таксама асобы, на карысць якіх у Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе зроблены запісы ў дачыненні да судна, павінны быць праінфармаваны аб гэтым. Аналагічныя дзеянні праводзяцца і ў выпадку адмены мер, указаных у гэтым артыкуле.

**Артыкул 27. Безгаспадарныя судны**

Безгаспадарныя судны прымае на ўлік орган па бяспецы суднаходства, упаўнаважаны Урадам Рэспублікі Беларусь (далей – орган па бяспецы суднаходства), на падставе заявы мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, на тэрыторыі якога яны знаходзяцца.

Выяўленне безгаспадарных суднаў ажыццяўляюць рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы ўнутраных водных шляхоў.

Пасля пастаноўкі безгаспадарнага судна на ўлік орган па бяспецы суднаходства прымае меры да выяўлення суднаўладальніка. Калі суднаўладальнік выяўлены, орган па бяспецы суднаходства павінен накіраваць яму прадпісанне з патрабаваннем аб транспарціроўцы судна ў вызначанае месца адстою. Пры выкананні гэтага патрабавання судна здымаецца з уліку.

Пасля сканчэння трох гадоў з дня пастаноўкі безгаспадарнага судна на ўлік орган, упаўнаважаны кіраваць маёмасцю, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, можа звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб прызнанні права камунальнай уласнасці на гэта судна.

Безгаспадарнае судна, не прызнанае па рашэнні суда паступіўшым у камунальную ўласнасць, можа быць ізноў прынята ў валоданне, карыстанне і распараджэнне ўласнікам, які пакінуў яго, або набыта ва ўласнасць з прычыны набыўной даўнасці.

**Артыкул 28. Сродкі ідэнтыфікацыі судна**

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь судна павінна мець назву. Пры дзяржаўнай рэгістрацыі ў суднавай кнізе судна можа мець назву. Назва судна надаецца яго ўласнікам і павінна адрозніваца ад назваў іншых зарэгістраваных суднаў.

Назва судна наносіцца на абодвух бартах у насавой частцы, крылах хадавога мастка і карме.

На суднах, якія ажыццяўляюць выхад за граніцы Рэспублікі Беларусь, назва судна на крылах хадавога мастка і на карме павінна быць нанесена лацінскімі літарамі з указаннем нацыянальнай прыналежнасці судна. На карме пад назвай судна ўказваецца пункт яго прыпіскі.

Новая назва можа быць нанесена на судна толькі пасля ўнясення адпаведнага змянення ў Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу. Аб змяненні назвы ўласнік судна павінен неадкладна паведаміць залогатрымальнікам зарэгістраваных іпатэк (закладаў) судна.

Судну, якое мае абсталяванне сувязі, надаецца пазыўны сігнал. У залежнасці ад тэхнічнай аснашчанасці судна яму надаюцца таксама ідэнтыфікацыйны нумар суднавай станцыі спадарожнікавай сувязі і нумар выбіральнага выкліку суднавай станцыі.

**Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя суднаў і праў на іх**

Дзяржаўнай рэгістрацыі падлягаюць судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання, маламерныя судны, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю меншай за 225 кілаграмаў.

Дзяржаўнай рэгістрацыі таксама падлягае права ўласнасці на судны, якія будуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем маламерных суднаў, або права на долю ў ёй.

Пад дзяржаўнай рэгістрацыяй судна і праў на яго разумеецца акт прызнання і пацвярджэння дзяржавай узнікнення, абмежавання (абцяжарвання), пераходу або спынення праў на судна ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Усе здзелкі, якія ажыццяўляюцца ў дачыненні да судна, якое падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, і якія цягнуць за сабой змяненне маёмасных праў на судна, у тым ліку іпатэка (заклад), падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі і прызнаюцца сапраўднымі толькі з моманту іх рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

**Артыкул 30. Рэестры суднаў**

Судна ўнутранага плавання і судна змешанага (рака – мора) плавання падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь.

Маламерныя судны, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю меншай за 225 кілаграмаў, падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў суднавай кнізе.

Зацікаўленыя асобы маюць права на атрыманне інфармацыі, якая змяшчаецца ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе, у парадку, установленым заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 31. Органы, якія ажыццяўляюць дзяржаўную рэгістрацыю суднаў**

Дзяржаўную рэгістрацыю суднаў унутранага плавання і суднаў змешанага (рака – мора) плавання ажыццяўляе орган па бяспецы суднаходства.

Дзяржаўную рэгістрацыю маламерных суднаў, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю меншай за 225 кілаграмаў, ажыццяўляе Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах.

**Артыкул 32. Умовы дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў**

Судна можа быць зарэгістравана толькі ў адным з рэестраў суднаў, указаных у частках першай і другой артыкула 30 гэтага Кодэкса.

Судны змешанага (рака – мора) плавання, якія выкарыстоўваюцца ў мэтах суднаходства з выхадам на марскія шляхі, па жаданні суднаўладальніка могуць быць зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь толькі пасля выключэння іх з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь.

Судна, зарэгістраванае ў рэестры суднаў замежнай дзяржавы, можа быць зарэгістравана ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе пры ўмове, калі яно выключана з рэестра суднаў замежнай дзяржавы з выдачай адпаведнага пасведчання або пасведчання, якое сведчыць, што гэта судна будзе неадкладна выключана з рэестра суднаў замежнай дзяржавы з моманту яго рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Замежнае судна, якое эксплуатуецца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і (або) грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа або дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), можа быць зарэгістравана ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь пасля прыпынення яго рэгістрацыі ў рэестры суднаў дзяржавы асноўнай рэгістрацыі з выдачай адпаведнага пасведчання або пры ўмове, калі на момант заключэння ўказаных дагавораў гэта судна не было ўнесена ў рэестр суднаў іншай дзяржавы.

Рэгістрацыя судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь, у рэестры суднаў замежнай дзяржавы не мае юрыдычнай сілы, калі судна не выключана ў вызначаным парадку з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі.

Судна, якое мае нацыянальнасць Рэспублікі Беларусь і эксплуатуецца замежнымі юрыдычнымі і (або) фізічнымі асобамі на падставе дагавора арэнды судна

без экіпажа або дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), можа быць зарэгістравана ў рэестры суднаў замежнай дзяржавы пры ўмове:

прыпынення яго рэгістрацыі ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе;

прадстаўлення пісьмовай згоды ўсіх залогатрымальнікаў зарэгістраваных іпатэк (закладаў) судна;

калі заканадаўства замежнай дзяржавы дапускае даванне судну права плавання пад сцягам гэтай дзяржавы.

Дазвол на перавод судна пад сцяг замежнай дзяржавы даецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Тэрмін, на які судна можа пераведзена пад сцяг замежнай дзяржавы, вызначаецца тэрмінам дзеяння дагавора яго арэнды, але не можа перавышаць двух гадоў.

**Артыкул 33. Парадак ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў**

Парадак ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў у Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь і суднавай кнізе ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе судна рэгіструецца на імя ўласніка.

Судна, якое эксплуатуецца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і (або) грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа або дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), за выключэннем маламернага судна, рэгіструецца ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь на імя арандатара або лізінгаатрымальніка судна.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь выдаюцца пасведчанне аб праве плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь і пасведчанне аб праве ўласнасці на судна, а пры рэгістрацыі судна ў суднавай кнізе выдаецца суднавы білет.

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе судну надаецца рэгістрацыйны нумар.

Орган, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў, адмаўляе ў дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах.

Адмова органа, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю суднаў, у дзяржаўнай рэгістрацыі судна можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 34. Рэгістрацыя змяненняў звестак, якія ўносяцца ў рэестры суднаў**

Уласнік, арандатар або лізінгаатрымальнік судна абавязаны паведаміць органу, які рэгіструе, аб любых змяненнях звестак, якія падлягаюць унясенню ў Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу, на працягу 14 каляндарных дзён з дня атрымання інфармацыі аб такіх змяненнях.

Пры пераходзе права ўласнасці на судна, якое падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, або на долю ў ёй у Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь або суднавую кнігу ўносяцца адпаведныя змяненні з указаннем даты рэгістрацыі права ўласнасці на судна або на долю ў ёй і выдаецца пасведчанне аб праве ўласнасці або суднавы білет на імя новага ўласніка.

**Артыкул 35. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай рэгістрацыі суднаў**

Асобы, якія ўхіляюцца ад дзяржаўнай рэгістрацыі судна, усіх відаў здзелак з ім, а таксама маёмасных праў на судна, таксама як і асобы, якія падалі недакладныя звесткі для рэгістрацыі судна, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 36. Выключэнне судна з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі**

Выключэнню з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі падлягаюць судны:

разабраныя пасля спісання;

затанулыя і не падлеглыя пад’ёму, за выключэннем выпадкаў, калі пад’ём судна з'яўляецца абавязковым у адпаведнасці з артыкулам 129 гэтага Кодэкса. У гэтых выпадках у Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе робіцца адзнака аб неабходнасці пад’ёму судна і вызначаных тэрмінах яго пад’ёму;

зніклыя без вестак;

якія канструктыўна загінулі, гэта значыць поўнасцю разбураныя і непадлеглыя аднаўленню або якія страцілі свае суднаходныя якасці ў выніку перабудовы.

Для выключэння судна з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі суднаўладальнік падае ў орган, які ажыццявіў дзяржаўную рэгістрацыю судна, дакументы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Калі судна, якое выключаецца з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі, з'яўляецца аб'ектам праў трэціх асоб, то выключэнне яго з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі можа быць праведзена з пісьмовай згоды гэтых асоб, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

**Артыкул 37. Права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь**

Права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь даецца суднам:

якія знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці Рэспублікі Беларусь;

якія знаходзіцца ў прыватнай уласнасці юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь і (або) грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў;

якія эксплуатуюцца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і (або) грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, на падставе дагавора арэнды судна без экіпажа або дагавора фінансавай арэнды (лізінгу). Пры гэтым права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь даецца гэтым суднам на тэрмін дзеяння дагавора арэнды судна без экіпажа або дагавора фінансавай арэнды (лізінгу).

Права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь узнікае з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе.

Судна, набытае за мяжой, карыстаецца правам плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь з моманту выдачы консулам Рэспублікі Беларусь часовага пасведчання на тэрмін, не большы за адзін год, якое пацвярджае гэта права,

і сапраўднага да моманту дзяржаўнай рэгістрацыі судна ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь або суднавай кнізе. Аб выдачы ўказанага пасведчання консул Рэспублікі Беларусь паведамляе рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту і рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь.

Судна губляе права плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь з моманту выключэння яго з Дзяржаўнага суднавага рэестра Рэспублікі Беларусь або суднавай кнігі.

**Артыкул 37[1]. Класіфікацыя маламерных суднаў**

Пры дзяржаўнай рэгістрацыі маламерных суднаў, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю меншай за 225 кілаграмаў, у мэтах вызначэння адпаведнасці іх фактычнага стану і канструктыўных асаблівасцей патрабаванням, указаным у інструкцыях па эксплуатацыі (пашпарце) маламернага судна і рухавіка (пры яго наяўнасці) або праваўстаноўчых дакументах, Дзяржаўнай інспекцыяй па маламерных суднах праводзіцца іх класіфікацыя.

Па выніках класіфікацыі маламернаму судну надаецца катэгорыя складанасці раёна плавання з указаннем разраду (пры яго наяўнасці).

Класіфікацыя маламерных суднаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах.

**Артыкул 38. Суднавыя дакументы**

На судне, зарэгістраваным у Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь, павінны знаходзіцца наступныя суднавыя дакументы:

пасведчанне аб праве плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь;

пасведчанне аб праве ўласнасці на судна;

пасведчанне аб прыдатнасці судна да плавання з указаннем яго класа або дадаваннем класіфікацыйнага пасведчання;

спіс членаў экіпажа судна (суднавая роль);

суднавы журнал (вахтавы журнал, адзіны вахтавы журнал);

машынны журнал (для суднаў з механічным рухавіком, што эксплуатуюцца членамі экіпажа, якія працуюць без сумяшчэння прафесій);

суднавае санітарнае пасведчанне;

адзіная кніга агляду судна;

пасведчанне аб прадухіленні забруджвання з судна нафтай, сцёкавымі водамі і адходамі;

дазвол на эксплуатацыю суднавай радыёстанцыі;

пасведчанне аб мінімальным саставе экіпажа судна, які забяспечвае бяспеку суднаходства (для самаходных транспартных суднаў).

На суднах, якія выходзяць за граніцы Рэспублікі Беларусь, акрамя дакументаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, павінны знаходзіцца дакументы, прадугледжаныя міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Дакументы, прадугледжаныя міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, выдае адпаведны дзяржаўны орган, упаўнаважаны Урадам Рэспублікі Беларусь.

На суднах змешанага (рака – мора) плавання, якія выходзяць на марскія шляхі (за выключэннем суднаў, якія выходзяць на вусцевыя ўчасткі рэк з марскім рэжымам суднаходства), акрамя дакументаў, указаных у частках першай і другой гэтага артыкула, павінны знаходзіцца дакументы, прадугледжаныя Кодэксам гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь.

На судне, зарэгістраваным у суднавай кнізе, павінны знаходзіцца суднавы білет і сертыфікат аб допуску судна да эксплуатацыі, які пацвярджае прызнанне маламернага судна прыгодным да эксплуатацыі па выніках яго тэхнічнага агляду.

На судне павінны знаходзіцца дакументы, указаныя ў гэтым артыкуле, у арыгіналах, за выключэннем пасведчання аб праве ўласнасці на судна, копія якога павінна быць заверана органам, які яго выдаў, або натарыусам.

Суднавыя дакументы, што ёсць на судне, якое плавае пад замежным сцягам і наведвае парты Рэспублікі Беларусь або праходзіць па ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, прызнаюцца на падставе міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 39. Парадак вядзення суднавага журнала**

Суднавы журнал вядзецца ў парадку, які вызначаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту, і павінен захоўвацца на судне на працягу двух гадоў з моманту ўнясення ў яго апошняга запісу. Пасля сканчэння гэтага тэрміну суднавы журнал здаецца на захоўванне суднаўладальніку. Суднавы журнал даецца для азнаямлення і зняцця копій асобам, якія маюць на гэта паўнамоцтвы, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 6
## ЭКІПАЖ СУДНА

Заўвага. Дзеянне гэтай главы не распаўсюджваецца на маламерныя судны.

**Артыкул 40. Састаў экіпажа судна**

Экіпаж судна складаецца з асоб каманднага саставу судна і суднавай каманды, а экіпаж пасажырскага судна – таксама з работнікаў, якія абслугоўваюць пасажыраў.

Да каманднага саставу судна адносяцца капітан (камандзір), памочнікі капітана (камандзіра), суднавыя механікі, электрамеханікі, радыёспецыялісты.

Суднавая каманда складаецца з асоб, якія не адносяцца да каманднага саставу судна і работнікаў, якія абслугоўваюць пасажыраў.

За выключэннем маламерных суднаў, мінімальны састаў экіпажа самаходнага транспартнага судна ў адпаведнасці з патрабаваннямі эксплуатацыі судна пэўнага тыпу ўстанаўлівае Палажэнне аб мінімальным саставе экіпажаў самаходных транспартных суднаў, якое зацвярджаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

**Артыкул 41. Патрабаванні да членаў экіпажа судна**

Да заняцця пасад каманднага саставу судна дапускаюцца асобы, якія маюць адпаведныя званні, устаноўленыя Палажэннем аб дыпламаванні і атэстацыі плаўсастава суднаў, што эксплуатуюцца на ўнутраных водных шляхах, за выключэннем маламерных суднаў, якое зацвярджаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Прысваенне званняў каманднага саставу судна сведчыцца выдачай адпаведных дыпломаў, кваліфікацыйных пасведчанняў у парадку, які ўстанаўлівае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Да службы на суднах унутранага плавання і суднах змешанага (рака – мора) плавання дапускаюцца асобы, прыдатныя па стане здароўя ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

У састаў экіпажа судна, акрамя грамадзян Рэспублікі Беларусь, могуць уваходзіць замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства.

Пасады капітана (камандзіра), старшага памочніка капітана (камандзіра), старшага механіка і радыёспецыялістаў на судне могуць займаць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь. Умовы, на якіх замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства могуць уваходзіць у састаў экіпажа судна, вызначае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Да службы на суднах, што выходзяць за граніцы Рэспублікі Беларусь, дапускаюцца асобы, якія маюць нацыянальнае пасведчанне асобы марака Рэспублікі Беларусь, афармленае ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 42. Працоўныя адносіны на судне**

Працоўныя адносіны членаў экіпажа судна і суднаўладальніка рэгулююцца Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам, Статутам службы на суднах унутранага воднага транспарту, галіновымі тарыфнымі пагадненнямі, калектыўнымі дагаворамі.

Суднаўладальнік прымае на работу членаў экіпажа судна толькі са згоды капітана (камандзіра) судна.

Адмова капітана (камандзіра) судна прыняць у састаў экіпажа судна асобу, накіраваную суднаўладальнікам, павінна быць абгрунтаванай.

Адмова капітана (камандзіра) судна з адпаведнай матывіроўкай афармляецца ў пісьмовай форме і перадаецца суднаўладальніку і асобе, якой капітанам (камандзірам) судна адмоўлена ў прыёме на работу.

Адмова ў прыёме на работу можа быць абскарджана ў суд.

Суднаўладальнік абавязаны забяспечыць членам экіпажа судна нармальныя ўмовы пражывання на судне і выканання працоўных абавязкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадку прычынення шкоды жыццю або здароўю члена экіпажа судна падчас яго знаходжання на судне, а таксама пры выкананні ўскладзеных на яго працоўных абавязкаў па-за суднам суднаўладальнік абавязаны кампенсаваць прычыненую яму шкоду ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 43. Асабістая маёмасць членаў экіпажа судна**

Любы член экіпажа судна мае права правозіць на судне маёмасць, прызначаную для асабістага карыстання. У выпадку страты або пашкоджання асабістай маёмасці членаў экіпажа судна з прычыны здарэння з суднам суднаўладальнік кампенсуе ім прычыненую шкоду.

Кошт асабістай маёмасці членаў экіпажа судна, вінаватых у здарэнні з суднам, пакрыццю не падлягае.

**Артыкул 44. Рэпатрыяцыя членаў экіпажа судна**

Суднаўладальнік абавязаны забяспечыць за свой кошт рэпатрыяцыю членаў экіпажа судна ў выпадках:

гібелі судна;

захворвання або атрымання траўмы членам экіпажа судна, якія патрабуюць лячэння па-за суднам;

спыненне працоўнага дагавора па ініцыятыве суднаўладальніка або члена экіпажа судна пасля заканчэння тэрміну дзеяння працоўнага дагавора;

немагчымасці выканання суднаўладальнікам сваіх абавязкаў у дачыненні да членаў экіпажа судна, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або працоўным дагаворам, з прычыны банкруцтва, продажу судна або змянення дзяржавы яго рэгістрацыі;

накіравання судна без згоды членаў экіпажа судна ў зону ваенных дзеянняў або эпідэмічнай небяспекі.

Рэпатрыяцыя члена экіпажа судна ажыццяўляецца згодна з яго выбарам у порт (пункт), у якім ён быў наняты на работу, або ў порт (пункт), указаны ў калектыўным або працоўным дагаворы.

Расходы на рэпатрыяцыю члена экіпажа судна ўключаюць выдаткі на дастаўку члена экіпажа судна і яго асабістай маёмасці вагой да 30 кілаграмаў у порт (пункт) у адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула, выдаткі на харчаванне і пражыванне да моманту прыбыцця ў гэты порт (пункт), а ў выпадку хваробы члена экіпажа судна – таксама выдаткі на лячэнне да яго транспартабельнага стану.

Калі прычынай рэпатрыяцыі члена экіпажа судна з'яўляецца парушэнне ім умоў працоўнага дагавора, суднаўладальнік мае права ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прыняць меры дысцыплінарнага ўздзеяння, а таксама вылічыць у яго поўнасцю або часткова выдаткі на рэпатрыяцыю.

**Артыкул 45. Паўнамоцтвы капітана (камандзіра) судна**

На капітана (камандзіра) судна ўскладаюцца абавязак кіраваць суднам, у тым ліку суднаваджэнне, а таксама абавязак прымаць усе меры для забеспячэння бяспекі суднаходства і падтрымання парадку на судне, аховы навакольнага асяроддзя і прадухілення прычынення шкоды судну, людзям, якія знаходзяцца на ім, і грузу.

Капітан (камандзір) судна з'яўляецца прадстаўніком суднаўладальніка і грузаўладальнікаў у дачыненні да здзелак, звязаных з забеспячэннем бяспекі суднаходства, захаванасці судна і (або) грузу.

Капітан (камандзір) судна як прадстаўнік суднаўладальніка і грузаўладальнікаў мае права прад'яўляць іскі і адказваць паісках, якія датычацца судна, грузу і правазной платы, калі ў пункце знаходжання судна не маецца іншых прадстаўнікоў суднаўладальніка або грузаўладальнікаў.

Калі, па меркаванні капітана (камандзіра) судна, судну пагражае немінучая гібель, капітан (камандзір) судна пасля прыняцця ўсіх мер для ратавання пасажыраў дазваляе экіпажу судна пакінуць судна.

Капітан (камандзір) судна пакідае судна апошнім, прыняўшы ўсе залежныя ад яго меры для ратавання суднавага, машыннага і радыёжурналаў, карт дадзенага рэйса, суднавай пячаткі, дакументаў і каштоўнасцей.

У выпадку смерці, хваробы капітана (камандзіра) судна або пры ўзнікненні іншых прычын, якія перашкаджаюць выкананню ім службовых абавязкаў, да атрымання распараджэння суднаўладальніка выкананне гэтых абавязкаў ускладаецца на старшага памочніка капітана.

У выпадку гібелі судна капітан (камандзір) судна захоўвае свае правы і абавязкі ў дачыненні да экіпажа судна.

### Артыкул 46. Правы і абавязкі капітана (камандзіра) судна па падтрыманні парадку на судне

Распараджэнні капітана (камандзіра) судна ў межах яго паўнамоцтваў павінны выконваць ўсе асобы, якія знаходзяцца на судне.

Капітан (камандзір) судна мае права заахвочваць членаў экіпажа судна, а таксама накладаць на іх дысцыплінарныя спагнанні, адхіляць іх ад выканання службовых абавязкаў у выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадку нападу на судна з мэтай здзяйснення проціпраўных дзеянняў капітан (камандзір) судна абавязаны прыняць усе магчымыя меры для забеспячэння бяспекі людзей і захаванасці маёмасці, якія знаходзяцца на судне.

### Артыкул 47. Абавязкі капітана (камандзіра) судна па аказанні дапамогі

Капітан (камандзір) судна, не падвяргаючы небяспецы судна, пасажыраў і членаў экіпажа, якія знаходзяцца на ім, груз і іншую маёмасць, абавязаны аказаць дапамогу любой асобе, якой пагражае небяспека гібелі.

Капітаны (камандзіры) суднаў, якія сутыкнуліся, абавязаны аказаць узаемную дапамогу суднам, іх пасажырам і членам экіпажаў, паведаміць адзін аднаму назвы сваіх суднаў і партоў (пунктаў) прыпіскі.

### Артыкул 48. Абавязкі капітана (камандзіра) судна ў выпадках нараджэння дзіцяці або смерці на судне

Капітан (камандзір) судна абавязаны аб кожным выпадку нараджэння дзіцяці або смерці на судне скласці акт пры ўдзеле двух сведак і медыцынскага работніка (калі ён ёсць на судне), а таксама зрабіць адпаведны запіс у суднавым журнале. Да акта аб смерці дадаецца вопіс маёмасці памерлага, якая знаходзіцца на судне. Капітан (камандзір) судна прымае меры для захавання гэтай маёмасці і паведамляе аб здарэнні адпаведным органам. Цела пармерлага  павінна быць неадкладна ізалявана і перададзена па акце сваякам або адміністрацыі бліжэйшага порта (пункта) для перадачы яго адпаведным органам.

У выпадку знікнення члена экіпажа судна або пасажыра пры абставінах, якія дапускаюць магчымасць іх гібелі, капітан (камандзір) судна робіць адпаведны запіс у суднавым журнале, складае акт, а таксама вопіс іх маёмасці, якая засталася, і перадае гэты акт і маёмасць члена экіпажа судна або пасажыра, які знік, у найбліжэйшым порце (пункце) адпаведным органам.

## ГЛАВА 6[1]
## КІРАВАННЕ МАЛАМЕРНЫМ СУДНАМ, ЯГО ЭКІПАЖ

### Артыкул 48[1]. Кіраванне маламерным суднам, састаў экіпажа маламернага судна

Абавязак кіраваць маламерным суднам ускладаецца на суднавадзіцеля.

Суднаўладальніку маламернага судна забараняецца дапускаць да кіравання маламерным суднам асобу:

якая не мае права кіравання маламерным суднам;

якая не мае пры сабе пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам або міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам – для асоб, якія дапускаюцца да кіравання маторным маламерным суднам;

якая знаходзіцца ў незашпіленай выратавальнай камізэльцы або без такой камізэлькі.

Экіпаж маламернага судна складаецца з суднавадзіцеля. У састаў экіпажа маламернага судна, акрамя суднавадзіцеля, могуць уваходзіць іншыя члены экіпажа.

**Артыкул 48$^2$. Патрабаванні да суднавадзіцеляў**

Да кіравання маламернымі суднамі, за выключэннем маторных маламерных суднаў, дапускаюцца асобы, якія дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту. Да дасягнення шаснаццацігадовага ўзросту да кіравання маламернымі суднамі, за выключэннем маторных маламерных суднаў, дапускаюцца асобы, што ўдзельнічаюць у спартыўна-масавых і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах, якія праводзяцца дзяржаўнымі арганізацыямі фізічнай культуры і спорту, спартыўных мерапрыемствах, а таксама асобы, што праходзяць спартыўную падрыхтоўку ў спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах, сярэдніх школах – вучылішчах алімпійскага рэзерву, клубах па відзе (відам) спорту.

Да кіравання маторнымі маламернымі суднамі дапускаюцца асобы, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, дапушчаныя па медыцынскіх паказаннях да кіравання маторнымі маламернымі суднамі, якія прайшлі праверку ведаў правіл кіравання маторнымі маламернымі суднамі і маюць пасведчанне на права кіравання маторным маламерным суднам або якія маюць міжнароднае пасведчанне на права кіравання прагулачным суднам.

Парадак і падставы выдачы, абмену, анулявання і адабрання пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам, а таксама выдачы яго дубліката вызначае Урад Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Парадак і падставы выдачы, абмену, анулявання і адабрання міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам, а таксама выдачы яго дубліката вызначае Урад Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Парадак медыцынскага агляду суднавадзіцеляў маторных маламерных суднаў, пералік медыцынскіх проціпаказанняў, якія перашкаджаюць кіраванню маторнымі маламернымі суднамі, вызначае Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 48$^3$. Паўнамоцтвы суднавадзіцеля**

Суднавадзіцель абавязаны:

прымаць усе меры для забеспячэння бяспекі суднаходства маламернага судна і падтрымання парадку на ім, аховы навакольнага асяроддзя і прадухілення прычынення шкоды судну, людзям, якія знаходзяцца на ім;

правяраць перад выхадам у плаванне спраўнасць і камплектнасць аснашчэння маламернага судна, сачыць за яго тэхнічным станам у ходзе плавання;

падчас руху маламернага судна быць у зашпіленай выратавальнай камізэльцы;

аказаць дапамогу любой асобе, якой пагражае небяспека гібелі, не падвяргаючы небяспецы маламернае судна і людзей, якія знаходзіцца на ім;

выконваць законныя патрабаванні службовых асоб Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах;

паведамляць аб усіх транспартных аварыйных выпадках, удзельнікам або сведкам якіх ён з'яўляўся, па тэлефонах 101 або 112;

выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку Правіламі карыстання маламернымі суднамі і базамі (збудаваннямі) для іх стаянак.

Пры сутыкненні маламернага судна з іншымі суднамі суднавадзіцель абавязаны аказаць дапамогу суднам, людзям, якія знаходзяцца на іх, паведаміць назву свайго маламернага судна (пры яго наяўнасці).

Распараджэнні суднавадзіцеля ў межах яго паўнамоцтваў павінны выконвацца ўсімі асобамі, якія знаходзяцца на судне.

Суднавадзіцелю забараняецца:

кіраваць маторным маламерным суднам, не маючы пры сабе пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам або міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам;

кіраваць маламерным судным у хваравітым або стомленым стане, які ставіць пад пагрозу бяспеку суднаходства, пад уздзеяннем лекавых сродкаў, якія зніжаюць увагу і хуткасць рэакцыі;

перадаваць кіраванне маламерным суднам асобе, якая не мае права кіравання маламерным суднам, асобе, якая не мае пры сабе пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам або міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам (акрамя выпадкаў навучання кіраванню маторным маламерным суднам або здачы практычнага экзамену на права кіравання маторным маламерным суднам);

ажыццяўляць іншыя дзеянні, забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку Правіламі карыстання маламернымі суднамі і базамі (збудаваннямі) для іх стаянак.

Суднавадзіцель затанулага маламернага судна або маламернага судна, якое ажыццяўляла буксіроўку судна або іншага плывучага аб'екта, якія патанулі падчас буксіроўкі, абавязаны неадкладна паведаміць у рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў і ўладальніку затанулага судна або іншага плывучага аб'екта аб факце ўтаплення маёмасці, яго прычынах, часе і месцы.

## ГЛАВА 7
## АРЭНДА (ФРАХТАВАННЕ НА ЧАС) СУДНА З ЭКІПАЖАМ

### Артыкул 49. Дагавор арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам

Па дагаворы арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам суднаўладальнік (арэндадавец) дае фрахтавальніку (арандатару) судна за плату ў часовае валоданне і карыстанне і аказвае паслугі па кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі.

Дагавор арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам заключаецца ў пісьмовай форме і павінен утрымліваць найменні бакоў, назву судна, указанне сцяга, пад якім плавае судна, тэхнічныя і эксплуатацыйныя даныя судна, раён плавання, мэты арэнды, памер платы (стаўку фрахту), парадак і тэрміны яе выплаты, тэрмін дзеяння дагавора, час і месца прыёму і здачы судна.

### Артыкул 50. Субарэнда судна з экіпажам

Фрахтавальнік (арандатар) мае права без згоды суднаўладальніка (арэндадаўца) здаваць арандаванае судна ў субарэнду, калі дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам не прадугледжана іншае.

Заключэнне дагавора субарэнды судна з экіпажам не вызваляе фрахтавальніка (арандатара) ад выканання абавязацельстваў па дагаворы, заключаным ім з суднаўладальнікам (арэндадаўцам).

На ўдзельнікаў дагавора субарэнды судна з экіпажам распаўсюджваецца дзеянне гэтага Кодэкса.

**Артыкул 51. Абавязкі суднаўладальніка (арэндадаўца) па ўтрыманні судна, кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі**

Суднаўладальнік (арэндадавец) на працягу ўсяго тэрміну дзеяння дагавора арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам абавязаны падтрымліваць судна ў належным стане, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту і даванне неабходных прыладаў .

Паслугі па кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі, якія аказваюцца фрахтавальніку (арандатару) суднаўладальнікам (арэндадаўцам), павінны забяспечыць нармальную і бяспечную эксплуатацыю судна ў адпаведнасці з мэтамі арэнды, указанымі ў дагаворы арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам.

Выдаткі на аплату паслуг членаў экіпажа судна, а таксама выдаткі на іх утрыманне нясе суднаўладальнік (арэндадавец), калі дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам не прадугледжана іншае.

**Артыкул 52. Абавязкі фрахтавальніка (арандатара) па камерцыйнай эксплуатацыі і звароце судна**

Фрахтавальнік (арандатар) абавязаны карыстацца суднам і паслугамі экіпажа судна ў адпаведнасці з мэтамі і ўмовамі іх давання, вызначанымі дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам.

Фрахтавальнік (арандатар) нясе выдаткі, якія ўзнікаюць у сувязі з камерцыйнай эксплуатацыяй судна, у тым ліку выдаткі на аплату паліва, іншых матэрыялаў, якія расходуюцца ў працэсе эксплуатацыі, і на аплату збораў, калі дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам не прадугледжана іншае.

Пасля заканчэння тэрміну дзеяння дагавора арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам фрахтавальнік (арандатар) абавязаны вярнуць судна ў тым стане, у якім яно ім было атрымана, за выключэннем нармальнага зносу.

Пры несвоечасовым звароце судна фрахтавальнік (арандатар) аплачвае час затрымкі судна па стаўцы фрахту, прадугледжанай у дагаворы арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам, або па рыначнай стаўцы фрахту, калі яна перавышае стаўку фрахту, прадугледжаную ў гэтым дагаворы.

**Артыкул 53. Выключаны**

**Артыкул 54. Падпарадкаванасць экіпажа судна**

Члены экіпажа судна з'яўляюцца работнікамі суднаўладальніка (арэндадаўца). Яны выконваюць распараджэнні суднаўладальніка (арэндадаўца), якія датычацца кіравання суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі, і распараджэнні фрахтавальніка (арандатара), якія датычацца камерцыйнай эксплуатацыі судна.

**Артыкул 55. Выплата фрахту**

Фрахтавальнік (арандатар) выплачвае суднаўладальніку (арэндадаўцу) фрахт у памеры, парадку і тэрміны, прадугледжаныя дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам. Фрахтавальнік (арандатар) вызваляецца ад выплаты фрахту і

аплаты выдаткаў на эксплуатацыю судна за час, на працягу якога яно было непрыдатным да эксплуатацыі з прычыны несуднаходнага стану.

Калі судна стала непрыдатным да эксплуатацыі па віне фрахтавальніка (арандатара), суднаўладальнік (арэндадавец) мае права на фрахт, прадугледжаны ў дагаворы арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам, незалежна ад пакрыцця фрахтавальнікам (арандатарам) прычыненых яму страт.

У выпадку пратэрміноўкі выплаты фрахту, якая перавышае 14 каляндарных дзён, суднаўладальнік (арэндадавец) мае права без папярэджання адабраць судна ў фрахтавальніка (арандатара) і сыскаць з яго прычыненыя пратэрміноўкай страты.

У выпадку гібелі судна фрахт падлягае выплаце па дзень гібелі судна ўключна, а калі гэты дзень выявіць немагчыма, – па дзень атрымання апошняга паведамлення аб ім.

### Артыкул 56. Узнагароджанне за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі

Узнагароджанне, належнае судну за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі, якая мела месца да заканчэння тэрміну дзеяння дагавора арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам, размяркоўваецца ў роўных долях паміж суднаўладальнікам (арэндадаўцам) і фрахтавальнікам (арандатарам) за вылікам выдаткаў на ратаванне і долі ўзнагароджання, належнай экіпажу судна.

### Артыкул 57. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) перад трэцімі асобамі

Калі судна дадзена фрахтавальніку (арандатару) для перавозкі грузаў, ён мае права ад свайго імені заключаць дагаворы перавозкі ўнутраным водным транспартам, выдаваць канасаменты і іншыя перавозачныя дакументы. Фрахтавальнік (арандатар) нясе адказнасць па абавязацельствах, якія вынікаюць з заключаных дагавораў і выдадзеных ім дакументаў.

### Артыкул 58. Адказнасць фрахтавальніка (арандатара) за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна

Фрахтавальнік (арандатар) абавязаны кампенсаваць страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна, калі суднаўладальнік (арэндадавец) дакажа, што ратаванне, гібель або пашкоджанне судна адбыліся з прычыны абставін, за якія фрахтавальнік (арандатар) адказвае ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або дагаворам арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам.

## ГЛАВА 8
## АРЭНДА СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА

### Артыкул 59. Дагавор арэнды судна без экіпажа

Па дагаворы арэнды судна без экіпажа арэндадавец дае арандатару судна за плату ў часовае валоданне і карыстанне без аказання паслуг па кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі.

Дагавор арэнды судна без экіпажа заключаецца ў пісьмовай форме і павінен змяшчаць найменні бакоў, назву судна, указанне сцяга, пад якім плавае судна,

тэхнічныя і эксплуатацыйныя даныя судна, раён плавання, мэты арэнды, памер арэнднай платы, тэрмін дзеяння дагавора, час і месца прыёму і здачы судна.

**Артыкул 60. Субарэнда судна без экіпажа**

Арандатар мае права без згоды арэндадаўца здаваць арандаванае судна ў субарэнду на ўмовах дагавора арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам або дагавора арэнды судна без экіпажа, калі дагаворам арэнды судна без экіпажа не прадугледжана іншае.

Заключэнне дагавора субарэнды судна без экіпажа не вызваляе арандатара ад выканання абавязацельстваў па дагаворы, заключаным ім з арэндадаўцам.

**Артыкул 61. Абавязак арэндадаўца па прывядзенні судна ў суднаходны стан**

Арэндадавец абавязаны прывесці судна ў суднаходны стан да моманту яго перадачы арандатару і прыняць меры для забеспячэння прыдатнасці корпуса судна, яго рухавіка і абсталявання для мэт арэнды, прадугледжаных дагаворам арэнды судна без экіпажа.

**Артыкул 62. Абавязкі арандатара па ўтрыманні судна, кіраванні суднам і яго тэхнічнай эксплуатацыі**

Арандатар на працягу ўсяго тэрміну дзеяння дагавора арэнды судна без экіпажа абавязаны падтрымліваць судна ў належным стане, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту.

Арандатар самастойна ажыццяўляе кіраванне суднам і яго камерцыйную і тэхнічную эксплуатацыю.

**Артыкул 63. Экіпаж судна**

Экіпаж судна камплектуе арандатар.

Капітан судна і іншыя члены экіпажа судна з'яўляюцца работнікамі арандатара і выконваюць яго ўказанні і распараджэнні.

**Артыкул 64. Плата па дагаворы арэнды судна без экіпажа**

Арандатар выплачвае арэндадаўцу плату па дагаворы арэнды судна без экіпажа наперад па месячнай стаўцы, узгодненай бакамі.

Арандатар вызваляецца ад платы па дагаворы арэнды судна без экіпажа і аплаты выдаткаў на эксплуатацыю судна за час, на працягу якога яно было непрыдатным да эксплуатацыі з прычыны несуднаходнага стану, за выключэннем выпадкаў, калі непрыдатнасць настала па віне арандатара або з прычыны вінаватых дзеянняў і (або) бяздзейнасці экіпажа судна.

У выпадку затрымкі платы па дагаворы арэнды судна без экіпажа, якая перавышае 14 каляндарных дзён, арэндадавец мае права без папярэджання адабраць судна ў арандатара і сыскаць з яго страты, прычыненыя затрымкай платы.

У выпадку гібелі судна плата па дагаворы арэнды судна без экіпажа праводзіцца па дзень гібелі судна ўключна, а калі гэты дзень выявіць немагчыма, – па дзень атрымання апошняга паведамлення аб ім.

### Артыкул 65. Правы і абавязкі арандатара па эксплуатацыі і звароце судна

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды судна без экіпажа, арандатар нясе выдаткі на ўтрыманне арандаванага судна, яго страхаванні, уключаючы страхаванне сваёй адказнасці, а таксама выдаткі, якія ўзнікаюць у сувязі з яго эксплуатацыяй.

Арандатар мае права без згоды арэндадаўца ад свайго імені заключаць з трэцімі асобамі дагаворы перавозкі і іншыя дагаворы, калі яны не супярэчаць мэтам выкарыстання судна па дагаворы арэнды судна без экіпажа.

Пасля заканчэння тэрміну дзеяння дагавора арэнды судна без экіпажа арандатар абавязаны вярнуць судна арэндадаўцу ў тым стане, у якім яно ім было атрымана, за выключэннем нармальнага зносу.

### Артыкул 66. Адказнасць арандатара перад трэцімі асобамі

Арандатар нясе адказнасць перад трэцімі асобамі па любых іх патрабаваннях, звязаных з эксплуатацыяй судна, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 67. Адказнасць арандатара за страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна

Арандатар абавязаны кампенсаваць страты, прычыненыя ратаваннем, гібеллю або пашкоджаннем судна, калі такія страты былі прычынены па яго віне, уключаючы віну экіпажа судна.

## ГЛАВА 9
## ПЕРАВОЗКА ГРУЗАЎ УНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ

### Артыкул 68. Агульныя ўмовы перавозкі грузаў унутраным водным транспартам

Перавозка грузаў унутраным водным транспартам выконваецца па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам або па дагаворы аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам.

Парадак падачы заявак на перавозку грузаў унутраным водным транспартам і ўмовы перавозкі грузаў унутраным водным транспартам устанаўліваюць Правілы перавозак грузаў, якія зацвярджае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту па ўзгадненні з іншымі зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання.

Перавозка грузаў, якая ажыццяўляецца перавозчыкам, прызнаецца перавозкай унутраным водным транспартам агульнага карыстання, калі з заканадаўства Рэспублікі Беларусь вынікае, што перавозчык абавязаны ажыццяўляць перавозкі грузаў унутраным водным транспартам па звароце любой асобы.

Пералік арганізацый, што адносяцца да ўнутранага воднага транспарту агульнага карыстання, публікуецца ў парадку, які ўстанаўлівае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

### Артыкул 69. Дагавор перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам

Па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам перавозчык абавязваецца даставіць давераны яму грузаадпраўшчыкам груз у пункт прызначэння і выдаць яго ўпаўнаважанай на атрыманне грузу асобе (грузаатрымальніку), а грузаадпраўшчык абавязваецца заплаціць за перавозку ўстаноўленую плату.

Заключэнне дагавора перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам пацвярджаецца складаннем канасамента. Канасамент афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Акрамя канасамента пры афармленні перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам афармляюцца іншыя перавозачныя дакументы, што з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх асоб, якія бяруць удзел у перавозцы грузаў унутраным водным транспартам. Формы і парадак запаўнення перавозачных дакументаў устанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў.

**Артыкул 70. Дагавор аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам**

Перавозчык і грузаўладальнік пры неабходнасці выканання сістэматычных перавозак грузаў унутраным водным транспартам могуць заключаць доўгатэрміновыя дагаворы аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам.

Па дагаворы аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам перавозчык абавязваецца ў вызначаныя тэрміны прымаць, а грузаўладальнік прад'яўляць да перавозкі грузы ў абумоўленым аб'ёме.

У дагаворы аб арганізацыі перавозак грузаў унутраным водным транспартам вызначаюцца аб'ёмы, тэрміны і іншыя ўмовы давання транспартных сродкаў і прад'яўлення грузаў для перавозкі ўнутраным водным транспартам, парадак разлікаў, а таксама іншыя ўмовы арганізацыі перавозак.

**Артыкул 71. Прад'яўленне і прыём грузу да перавозкі ўнутраным водным транспартам**

Грузаадпраўшчык да прад'яўлення грузу да перавозкі ўнутраным водным транспартам абавязаны падрыхтаваць яго такім чынам, каб забяспечваліся бяспека транспарціроўкі, захаванасць грузу, судна і кантэйнераў, а таксама рацыянальнае выкарыстанне грузападымальнасці і ўмяшчальнасці судна і кантэйнераў.

Пры прад'яўленні грузу да перавозкі ўнутраным водным транспартам грузаадпраўшчык павінен прадставіць канасамент і прыкласці да яго суправаджальныя дакументы, неабходныя для выканання мытных і іншых працэдур на ўсім шляху руху грузу ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Перавозчык мае права праверыць дакладнасць звестак, пазначаных у канасаменце.

Грузы, якія прад'яўляюцца да перавозкі ўнутраным водным транспартам, у тым ліку тарныя і штучныя грузы, транспартныя пакеты, павінны быць замаркіраваны грузаадпраўшчыкам у адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі на маркіроўку грузаў і Правіламі перавозак грузаў.

Парадак прыёму грузаў да перавозкі ўнутраным водным транспартам вызначаецца Правіламі перавозак грузаў, калі пагадненнем бакоў не ўстаноўлена іншае.

**Артыкул 72. Вызначэнне масы грузаў**

Пры прад'яўленні грузаў да перавозкі ўнутраным водным транспартам грузаадпраўшчык указвае ў канасаменце іх масу, якая вызначаецца па трафарэце, тэхнічных нарматыўных прававых актах у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі або шляхам узважвання, а для тарных і штучных грузаў – і колькасць месцаў. У выпадках, прадугледжаных Правіламі перавозак грузаў, дапускаецца вызначэнне масы асобных грузаў разліковым шляхам (па абмеры грузу, асадцы судна або ўмоўна). Масу грузу па трафарэце, тэхнічных нарматыўных прававых актах у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі, разліковым шляхам (па абмеры або ўмоўна) вызначае грузаадпраўшчык.

Грузы ў кантэйнерах прымаюцца да перавозкі ўнутраным водным транспартам у адпаведнасці з масай, пазначанай грузаадпраўшчыкам.

Масу грузаў, што перавозяцца налівам, вызначае грузаадпраўшчыкам па замерах берагавых рэзервуараў, якія маюць зацверджаныя ва ўстаноўленым парадку калібровачныя табліцы, а таксама па паказаннях лічыльнікаў або замерах грузавых ёмістасцей суднаў. У выпадках, калі грузы перавозяцца з перагрузкай на шляху з судна ў судна або ў адным судне на адрас некалькіх грузаатрымальнікаў, масу грузаў вызначае грузаадпраўшчык з удзелам перавозчыка.

**Артыкул 73. Патрабаванні да суднаў і кантэйнераў**

Судны і кантэйнеры павінны падавацца перавозчыкам пад пагрузку ў спраўным стане, прыдатным для перавозкі ўнутраным водным транспартам грузу, які прад'яўляецца.

Прыдатнасць суднаў і кантэйнераў для перавозкі грузу, які прад'яўляецца, вызначаецца грузаадпраўшчыкам або ўпаўнаважанай ім асобай на падставе патрабаванняў, устаноўленых Правіламі перавозак грузаў.

Грузаадпраўшчык мае права адмовіцца ад пададзеных транспартных сродкаў, калі яны непрыдатныя для перавозкі адпаведнага грузу.

Падача судна пад загрузку ў стане, непрыдатным для перавозкі грузу, які прад'яўляецца, унутраным водным транспартам, прыраўноўваецца да непадачы судна.

**Артыкул 74. Размяшчэнне і замацаванне грузаў на суднах**

Спосабы размяшчэння і мацавання грузаў на суднах з указаннем неабходных для пагрузкі, замацавання і перавозкі грузаў прыстасаванняў і матэрыялаў (пракладак, стоек, дроту, канатаў, брызенту і да т.п.), а таксама нарматывы давання такіх прыстасаванняў і матэрыялаў устанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў.

Прыстасаванні і матэрыялы (пракладкі, стойкі, дрот, канаты, брызент і да т. п.), неабходныя для пагрузкі, замацавання і перавозкі грузаў, даюцца, усталёўваюцца і здымаюцца грузаадпраўшчыкам, грузаатрымальнікам за кошт уласных сродкаў, калі дагаворам перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам не прадугледжана іншае.

### Артыкул 75. Падача транспартных сродкаў, пагрузка і выгрузка грузу

Перавозчык не пазней чым за 24 гадзіны да прыбыцця судна абавязаны паведаміць грузаадпраўшчыку аб часе прыбыцця судна ў пункт пагрузкі грузу, а грузаатрымальніку – аб часе прыбыцця судна ў пункт выгрузкі.

Перавозчык абавязаны падаць судна да месца пагрузкі або выгрузкі грузу, узгодненага з грузаадпраўшчыкам, грузаатрымальнікам, паведаміўшы аб падачы судна пад пагрузку або выгрузку грузу не пазней чым за шэсць гадзін да падачы судна. Калі судна пададзена без паведамлення або з парушэннем устаноўленых гэтым артыкулам тэрмінаў паведамлення, то да нарматыўнага тэрміну загрузкі або разгрузкі судна на падрыхтоўку да пагрузачна-разгрузачных работ дадаецца час да шасці гадзін.

Пагрузку або выгрузку грузаў ажыццяўляе перавозчык, грузаадпраўшчык або грузаатрымальнік у парадку, прадугледжаным дагаворам перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам, з выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Пагрузку грузаў у кантэйнеры і выгрузка іх з кантэйнераў праводзяць грузаадпраўшчык і грузаатрымальнік.

Пагрузка і выгрузка грузаў праводзяцца кругласутачна, калі пагадненнем бакоў не вызначана іншае.

Тэрміны пагрузкі і выгрузкі грузаў лічацца з моманту падачы судна да прычала або з моманту заканчэння загрузкі (разгрузкі) папярэдняга судна.

Нарматыўны час на загрузку (разгрузку) судна вызначаецца ў адпаведнасці з устаноўленымі нормамі і правіламі, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту. Пагадненнем бакоў могуць устанаўлівацца скарочаныя тэрміны загрузкі (разгрузкі) суднаў.

Загрузка судна або кантэйнера праводзіцца не ніжэй тэхнічных норм іх загрузкі, устаноўленых Правіламі перавозак грузаў, а пры адсутнасці такіх норм – да поўнай грузападымальнасці або грузаёмістасці судна або кантэйнера, калі пагадненнем бакоў не вызначана іншае.

Абмежаванні па асадцы судна могуць быць вызначаны ў адпаведнасці з Правіламі тэхнічнай эксплуатацыі ўнутранага воднага транспарту, якія зацвярджае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Пры невыкананні ўмоў пагрузкі і размяшчэння грузу пагрузка яго можа быць спынена са складаннем адпаведнага акта згодна з Правіламі перавозак грузаў і наступным спагнаннем з вінаватага боку прычыненых у сувязі з гэтым страт.

### Артыкул 76. Пламбаванне суднаў і кантэйнераў

Загружаныя трумы суднаў, у тым ліку рэфрыжэратарныя і наліўныя, а таксама кантэйнеры павінны быць апламбаваны грузаадпраўшчыкам, калі груз ім пагружаны.

Кантэйнеры з грузамі для асабістых (бытавых) патрэб пры аказанні паслуг фізічным асобам пламбіруюцца перавозчыкам або экспедытарам паводле меркавання грузаадпраўшчыка і за яго кошт.

Пералік грузаў, дапушчальных да перавозкі ў трумах суднаў без пломбаў, і парадак пламбавання суднаў і кантэйнераў устанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў.

Запорна-пламбіровачныя прылады і прылады для іх зняцця даюцца перавозчыкамі грузаадпраўшчыкам, грузаатрымальнікам за плату згодна з фактычнымі выдаткамі.

### Артыкул 77. Правазная плата і выплаты за перавозку грузаў унутраным водным транспартам

За перавозку грузаў унутраным водным транспартам спаганяецца правазная плата, устаноўленая пагадненнем бакоў, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

Плата за перавозку грузаў унутраным водным транспартам агульнага карыстання вызначаецца на падставе тарыфаў. Работы і паслугі, якія выконваюцца перавозчыкам па патрабаванні грузаўладальніка і не прадугледжаныя тарыфамі, аплачваюцца па пагадненні бакоў.

У выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлены льготы або перавагі па правазной плаце за перавозку грузаў унутраным водным транспартам, панесеныя ў сувязі з гэтым выдаткі кампенсуюцца транспартнай арганізацыі за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту.

Правазная плата за перавозку грузу ўнутраным водным транспартам і іншыя выплаты, належныя перавозчыку, уносяцца грузаадпраўшчыкам да моманту адпраўлення грузу з порта адпраўлення, калі пагадненнем бакоў не прадугледжана іншае.

Пры несвоечасовым унясенні правазной платы і іншых выплат адпраўленне грузу перавозчыкам можа быць затрымана і да іх унясення можа быць спынена падача судна для наступнай пагрузкі грузу.

Перавозчык мае права утрымліваць перададзеныя яму для перавозкі грузы ў забеспячэнне належнай яму правазной платы і іншых выплат, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або не вынікае з сутнасці абавязацельстваў па дагаворы.

### Артыкул 78. Тэрміны дастаўкі грузаў унутраным водным транспартам

Грузы, якія перавозяцца, павінны дастаўляцца ў пункт прызначэння ў вызначаныя тэрміны. Тэрміны дастаўкі грузаў унутраным водным транспартам, а таксама парадак іх падліку вызначаюцца ў адпаведнасці з Правіламі перавозак грузаў.

### Артыкул 79. Абмежаванне або спыненне перавозкі грузаў

З прычыны непераадольнай сілы або ваенных дзеянняў, абвяшчэння каранціну, а таксама пры празмерна вялікай колькасці грузаў і суднаў у порце ў мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства, аховы жыцця і здароўя людзей, захаванасці грузаў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў мае права прыняць рашэнне аб абмежаванні або спыненні перавозкі грузаў на пэўных участках з неадкладным паведамленнем рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту, які ўстанаўлівае тэрмін дзеяння абмежавання або спынення перавозкі грузаў. Аб прынятым рашэнні рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў абвяшчае ў парадку, устаноўленым Правіламі перавозак грузаў, з указаннем прычын і тэрмінаў абмежавання або спынення перавозкі грузаў.

### Артыкул 80. Права распараджэння грузам

Грузаадпраўшчык мае права распараджацца грузам да моманту яго выдачы грузаатрымальніку або да моманту перадачы ім гэтага права грузаатрымальніку або трэцяй асобе з паведамленнем перавозчыку аб такой перадачы.

Грузаадпраўшчык мае права запатрабаваць зварот грузу ў пункце адпраўлення да адыходу судна.

Грузаадпраўшчык да моманту ўручэння перавозчыкам грузаатрымальніку канасамента, а грузаатрымальнік з моманту атрымання канасамента ад перавозчыка да пачатку выдачы грузу мае права зрабіць замену грузаатрымальніка без змянення або са змяненнем пункта прызначэння.

Асоба, на патрабаванне якой змянены грузаатрымальнік або пункт прызначэння, з'яўляецца адказнай за гэтыя дзеянні і абавязана ўрэгуляваць разлікі паміж грузаадпраўшчыкам, першапачатковым грузаатрымальнікам, фактычным грузаатрымальнікам і перавозчыкам.

Парадак змянення грузаатрымальніка і пункта прызначэння ўстанаўліваецца Правіламі перавозак грузаў.

**Артыкул 81. Груз, пагружаны без ведама перавозчыка**

Перавозчык мае права выгрузіць з судна ў любым порце груз, пагружаны без яго ведама. У гэтым выпадку ўсе выдаткі перавозчыка, звязаныя з гэтым грузам, нясе грузаадпраўшчык.

**Артыкул 82. Захоўванне і выдача грузу грузаатрымальніку**

Перавозчык абавязаны паведаміць грузаатрымальніку аб грузах, якія прыбылі на яго імя, не пазней 12 гадзін дня, які ідзе следам за днём прыбыцця грузаў.

Груз выдаецца грузаатрымальніку, указанаму ў канасаменце, або іншай ўпаўнаважанай на атрыманне грузу асобе пасля ўнясення ўсіх належных перавозчыку выплат, звязаных з перавозкай грузу ўнутраным водным транспартам.

Грузаатрымальнік абавязаны прыняць і своечасова вывезці з порта груз, які прыбыў на яго імя. Парадак выдачы і вывазу грузаў вызначаецца Правіламі перавозак грузаў, калі пагадненнем бакоў не вызначана іншае.

У выпадку, калі да выдачы грузу або падчас яго выдачы грузаатрымальнік у пісьмовай форме не зрабіў заявы перавозчыку аб страце або аб пашкоджанні (псуце) грузу і не ўказаў іх агульны характар, лічыцца, што груз выдадзены грузаатрымальніку ў адпаведнасці з умовамі перавозкі.

Груз, які прыбыў, захоўваецца ў порце прызначэння бясплатна на працягу сутак, не лічачы дня прыбыцця грузу. Астатні час груз захоўваецца за плату, прадугледжаную пагадненнем бакоў. Пры затрымцы выдачы грузу па віне перавозчыка выдаткі на захоўванне грузу нясе перавозчык.

Калі ў порце прызначэння грузаатрымальнік не запатрабаваў груз, або ад яго адмовіўся, або затрымлівае прыём грузу такім чынам, што груз не можа быць выгружаны ў вызначаны час, перавозчык мае права пасля паведамлення аб гэтым грузаадпраўшчыку, а таксама грузаатрымальніку, калі ён яму вядомы, здаць груз на захоўванне за кошт і пад адказнасць асобы, правамоцнай распараджацца грузам.

Грузаатрымальнік можа адмовіцца ад прыёму грузу, за выключэннем небяспечнага і скорапсавальнага грузу, толькі ў выпадку, калі яго якасць з прычыны пашкоджання (псуты) змянілася настолькі, наколькі выключаецца магчымасць поўнага або частковага выкарыстання такога грузу, што пацвярджаецца высновамі

незалежнай экспертызы. У гэтым выпадку перавозчык рэалізуе груз і ажыццяўляе неабходныя разлікі.

### Артыкул 83. Праверка грузу пры выдачы

У выпадку прыбыцця грузу ў пункт прызначэння на няспраўным судне або з няспраўнымі запорна-пламбіровачнымі прыладамі, а таксама з прыкметамі недастачы або пашкоджання (псуты) перавозчык і грузаатрымальнік абавязаны сумесна праверыць масу грузу. Маса грузу ў пункце прызначэння правяраецца тым жа спосабам, што і ў пункце адпраўлення.

Пры спраўнасці транспартнай тары або цэласнасці пакета груз выдаецца па колькасці месцаў (пакетаў) без праверкі масы, калі дагаворам перавозкі грузу не вызначана іншае. Пры перавозцы грузу, прынятага па тэхнічных нарматыўных прававых актах у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі або масе, вызначанай грузаадпраўшчыкам, у пункце прызначэння правяраецца маса толькі пашкоджаных месцаў (пакетаў).

Маса грузу лічыцца правільнай, калі розніца ў масе грузу, вызначанай у пункце адпраўлення, у параўнанні з фактычнай масай, вызначанай у пункце прызначэння, не перавышае нормы натуральнай страты масы дадзенага грузу і разыходжання ў паказаннях вагаў у межах дапушчальнай хібнасці. Нормы натуральнай страты масы грузаў пры перавозцы іх унутраным водным транспартам устанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў.

Калі недастача або пашкоджанне (псута) грузу выяўлены ў пункце прызначэння, перавозчык абавязаны вызначыць памер фактычнай недастачы або пашкоджання (псуты) грузу і суму, на якую зменшыўся яго кошт. Выдаткі, звязаныя з вызначэннем памеру фактычнай недастачы або пашкоджання (псуты) грузу і пакрыццём кошту адсутнага або пашкоджанага (сапсаванага) грузу, нясе перавозчык.

### Артыкул 84. Ачыстка суднаў

Пасля заканчэння выгрузкі грузу судна павінна быць ачышчана, а ў неабходных выпадках вымыта і падвергнута дэгазацыі, дэзінсекцыі і дэзінфекцыі сіламі і сродкамі грузаўладальніка. Перавозчык можа на падставе пагаднення з грузаадпраўшчыкам або грузаатрымальнікам за асобную плату выконваць работы па ачыстцы судна.

Нафтаналіўныя судны пасля разгрузкі ачышчаюцца ў выпадках, прадугледжаных тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі, а таксама пры накіраванні іх на рамонт або адстой.

Парадак і ўмовы выканання работ па ачыстцы суднаў устанаўліваюцца на падставе Правіл перавозак грузаў, калі пагадненнем бакоў не прадугледжана іншае.

### Артыкул 85. Незапатрабаваны груз

Калі на працягу тэрмінаў, прадугледжаных Правіламі перавозак грузаў або пагадненнем бакоў, груз не прыняты і не вывезены грузаатрымальнікам, ён лічыцца незапатрабаваным. Пры гэтым перавозчык абавязаны паведаміць грузаадпраўшчыку аб тым, што яго груз не запатрабаваны.

Незапатрабаваны груз перавозчык мае права рэалізаваць у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 86. Асаблівыя ўмовы перавозкі грузаў унутраным водным транспартам**

Грузаадпраўшчыкі могуць прад'яўляць да перавозкі грузы з аб'яўленай цэннасцю. Прад'яўленне да перавозкі грузаў унутраным водным транспартам з аб'яўленай цэннасцю ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі перавозак грузаў.

За аб'яўленую цэннасць грузу спаганяецца плата ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Перавозка асобных відаў грузаў унутраным водным транспартам выконваецца ў суправаджэнні прадстаўнікоў грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка. Парадак і пералік грузаў, якія перавозяцца ў суправаджэнні прадстаўнікоў грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка, устанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў або пагадненнем бакоў.

**Артыкул 87. Наступствы немагчымасці дастаўкі грузу**

Да адпраўлення судна з пункта пагрузкі грузаадпраўшчык і перавозчык мае права адмовіцца ад выканання абавязацельстваў па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам без пакрыцця іншаму боку страт у выпадках узнікнення абставін непераадольнай сілы або ваенных дзеянняў. Пры гэтым перавозчык не нясе расходаў па разгрузцы судна.

Грузаадпраўшчык і перавозчык з прычыны абставін, указаных у частцы першай гэтага артыкула, мае права адмовіцца ад выканання абавязацельстваў па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам і падчас рэйса судна. У гэтым выпадку грузаадпраўшчык кампенсуе перавозчыку выдаткі па выгрузцы грузу, а таксама іншыя выдаткі, звязаныя з перавозкай грузу, у памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам. Правазная плата за няпройдзеную адлегласць вяртаецца грузаадпраўшчыку, які аплаціў перавозку грузу.

Выкананне дагавора перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам спыняецца незалежна ад волі бакоў, калі да адпраўлення судна ў рэйс з пункта пагрузкі загінуць груз і (або) судна. Пры гэтым ні адзін з бакоў не мае права патрабаваць ад іншага боку выканання абавязацельстваў па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам.

Выкананне абавязацельстваў па дагаворы перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам з прычыны наступлення абставін, указаных у частцы трэцяй гэтага артыкула, спыняецца незалежна ад волі бакоў і падчас рэйса судна. У гэтым выпадку грузаадпраўшчык аплачвае выдаткі на перавозку грузу ў памеры, прапарцыянальным адлегласці, фактычна пройдзенай суднам, зыходзячы з колькасці выратаванага і выдадзенага грузаатрымальніку грузу. Правазная плата за няпройдзеную адлегласць вяртаецца грузаадпраўшчыку, які аплаціў перавозку грузу.

**Артыкул 88. Перавозка небяспечных грузаў унутраным водным транспартам**

Перавозка небяспечных грузаў унутраным водным транспартам ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 89. Выключаны**

**Артыкул 90. Перавозкі воінскіх грузаў унутраным водным транспартам**

Парадак арганізацыі і выканання перавозак воінскіх грузаў унутраным водным транспартам устанаўлівае Урад Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 91. Перавозкі грузаў у змешаных зносінах**

Перавозкі грузаў могуць выконвацца ў змешаных зносінах пры ўзаемадзеянні ўнутранага воднага транспарту з іншымі відамі транспарту.

Перавозкі грузаў у прамых змешаных зносінах выконваюцца па адзіным транспартным дакуменце, складзеным на ўвесь шлях руху грузаў.

Змешаная перавозка грузаў ажыццяўляецца або забяспечваецца экспедытарам па дагаворы транспартнай экспедыцыі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Узаемаадносіны перавозчыкаў, якія выконваюць перавозкі рознымі відамі транспарту, а таксама парадак арганізацыі і выканання перавозак грузаў у прамых змешаных зносінах вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 92. Выключаны**

## ГЛАВА 10
## БУКСІРОЎКА СУДНАЎ, ПЛЫТОЎ І ІНШЫХ ПЛЫВУЧЫХ АБ'ЕКТАЎ

**Артыкул 93. Дагавор буксіроўкі ўнутраным водным транспартам**

У адпаведнасці з дагаворам буксіроўкі ўнутраным водным транспартам адзін бок (буксіроўшчык) абавязваецца своечасова і ў захаванасці даставіць буксаваныя судны, плыты або іншыя плывучыя аб'ектыў пункт прызначэння з выкананнем умоў буксіроўкі і здаць іх атрымальніку, указанаму ў канасаменце, а іншы бок (адпраўшчык) абавязваецца прад'явіць судны, плыты або іншыя плывучыя аб'екты да буксіроўкі і аплаціць буксіроўку.

Заключэнне дагавора буксіроўкі пацвярджаецца канасаментам. Для афармлення адносін, звязаных з буксіроўкай унутраным водным транспартам, акрамя канасамента, прымяняюцца таксама іншыя дакументы, формы і парадак запаўнення якіх устанаўліваюцца Правіламі буксіроўкі, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Пры неабходнасці ажыццяўлення сістэматычных буксіровак бакі могуць заключыць дагавор аб арганізацыі буксіровак, у якім вызначаюцца адказнасць бакоў, аб'ём, тэрміны, умовы ажыццяўлення, аплаты буксіровак і парадак разлікаў за іх, а таксама іншыя ўмовы арганізацыі буксіровак.

Буксіроўка суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі буксіроўкі.

Да адносін, не ўрэгуляваных палажэннямі гэтай главы, прымяняюцца адпаведныя палажэнні главы 9 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 94. Прад'яўленне буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў да буксіроўкі**

Судны, плыты або іншыя плывучыя аб'екты павінны быць прад'яўлены да буксіроўкі іх уладальнікам або ўпаўнаважанай ім асобай (адпраўшчыкам) у стане, прыгодным для бяспечнага плавання ў адпаведнасці з Правіламі буксіроўкі,

тэхнічнымі ўмовамі збівання, фарміравання і аснасткі плытоў, а таксама дагаворам буксіроўкі ўнутраным водным транспартам або дагаворам аб арганізацыі буксіровак унутраным водным транспартам.

Буксаваныя судны, плыты або іншыя плывучыя аб'екты павінны быць укамплектаваны экіпажам або праваднікамі ў адпаведнасці з Правіламі буксіроўкі.

Тэхнічныя ўмовы збівання, фарміравання і аснасткі плытоў распрацоўваюцца і зацвярджаюцца вырабляльнікамі плытоў і ўзгадняюцца з органам па бяспецы суднаходства.

Экіпаж буксаванага судна абавязаны выконваць распараджэнні капітана судна, якое буксіруе, па забеспячэнні бяспекі суднаходства, захаванасці буксаванага судна і прымаць меры па папярэджанні транспартных аварыйных выпадкаў.

Буксаваныя судны, плыты або іншыя плывучыя аб'екты павінны быць прад'яўлены адпраўшчыкам буксіроўшчыку для агляду не пазней чым за 12 гадзін да адпраўлення.

### Артыкул 95. Абавязкі адпраўшчыка плытоў

Адпраўшчык плытоў абавязаны праводзіць:

фарміраванне плытоў, іх вывадку і прад'яўленне да буксіроўкі, а таксама пастаноўку ў пункце прызначэння ў тэрміны, узгодненыя з буксіроўшчыкам;

абсталяванне прычальных прылад у пунктах адпраўлення і прызначэння, а таксама ў пунктах часовага адстою і перафарміравання плытоў;

расчальванне (звязванне) плытоў на шляху для прахода шлюзаў, мастоў, парогаў, перакатаў і іншыхя цяжкіх для суднаходства ўчасткаў, а таксама праводку плытоў дапаможнымі суднамі праз гэтыя ўчасткі;

прафілактычны і аварыйны рамонт плытоў на шляху руху.

Калі буксіроўшчыкам выдзяляюцца дапаможныя судны для суправаджэння плытоў на цяжкіх участках, з адпраўшчыка плытоў спаганяецца плата ў памеры, вызначаным пагадненнем бакоў.

### Артыкул 96. Прыём суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў да буксіроўкі

Буксіроўшчык абавязаны да прыёму буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў зрабіць іх агляд у адпаведнасці з Правіламі плавання па ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, якія зацвярджае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту, а таксама тэхнічнымі ўмовамі збівання, фарміравання і аснасткі плытоў.

У выпадку выяўлення дэфектаў буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў складаецца акт з указаннем гэтых дэфектаў і тэрмінаў іх ліквідацыі.

Пры адсутнасці або ліквідацыі дэфектаў, якія перашкаджаюць буксіроўцы, бакі складаюць акт аб гатоўнасці суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў да буксіроўкі, на падставе якога афармляецца канасамент на буксіроўку.

### Артыкул 97. Ліквідацыя наступстваў транспартных аварыйных выпадкаў з буксаванымі суднамі, плытамі і іншымі плывучымі аб'ектамі

Пры ўзнікненні транспартнага аварыйнага выпадку з буксаванымі суднамі, плытамі або іншымі плывучымі аб'ектамі капітан судна, якое буксіруе, экіпаж буксаванага судна, адпраўшчык буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў абавязаны сумесна прыняць меры па ліквідацыі наступстваў, выкліканых гэтым выпадкам, і змяншэнні прычыненай шкоды.

### Артыкул 98. Здача буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў ў пункце прызначэння

Буксіроўшчык абавязаны паведаміць атрымальніку аб часе прыбыцця буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў ў пункт прызначэння не пазней чым за 24 гадзіны да іх прыбыцця.

Атрымальнік абавязаны паведаміць буксіроўшчыку аб пункце прыёму буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, а таксама ажыццявіць іх прыём і забяспечыць бяспечную пастаноўку.

Пры здачы суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, дастаўленых з прыкметамі пашкоджання, праводзяцца іх агляд і ацэнка пашкоджанняў у парадку, які вызначаецца Правіламі буксіроўкі.

### Артыкул 99. Захоўванне і адстой буксаваных суднаў, плытоў і іншых плывучых аб'ектаў пасля сканчэння тэрмінаў іх абавязковага прыёму да буксіроўкі

Калі буксаваныя судны, плыты або іншыя плывучыя аб'екты, прынятыя да буксіроўкі, пасля сканчэння тэрмінаў спынення іх абавязковага прыёму да буксіроўкі не могуць быць дастаўлены па прызначэнні, яны павінны быць прыняты іх адпраўшчыкамі на захоўванне і пастаўлены на працяглы або зімовы адстой у пункце прыпынку руху. У гэтым выпадку правазная плата за няпройдзеную адлегласць буксіроўкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў вяртаецца іх адпраўшчыкам.

## ГЛАВА 11
## ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ І БАГАЖУ ЎНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ

### Артыкул 100. Агульныя ўмовы перавозкі пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам

Перавозка пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам выконваецца на падставе дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам або дагавора аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам.

Перавозка пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам выконваецца ў адпаведнасці з Правіламі перавозак пасажыраў і багажу, якія зацвярджае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

### Артыкул 101. Дагавор перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам

Па дагаворы перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам перавозчык абавязваецца перавезці пасажыра ў пункт прызначэння, а ў выпадку здачы пасажырам багажу — таксама даставіць багаж у пункт прызначэння і выдаць яго

ўпаўнаважанай на атрыманне багажу асобе; пасажыр абавязваецца заплаціць устаноўленую плату за праезд, а пры здачы багажу – і за правоз багажу.

Заключэнне дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам сведчыцца білетам, а здача пасажырам багажу – багажнай квітанцыяй.

На турысцкіх і экскурсійна-прагулачных маршрутах дагавор перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам сведчыцца пуцёўкай.

Формы білетаў, пуцёвак і багажных квітанцый устанаўліваюцца Правіламі перавозак пасажыраў і багажу.

**Артыкул 102. Перавозка пасажыраў унутраным водным транспартам агульнага карыстання**

Перавозка пасажыраў, якую выконвае перавозчык, прызнаецца перавозкай унутраным водным транспартам агульнага карыстання, калі з заканадаўства Рэспублікі Беларусь вынікае, што перавозчык абавязаны выконваць перавозкі пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам на зварот любой асобы.

Пералік арганізацый, абавязаных выконваць перавозкі пасажыраў, якія прызнаюцца перавозкамі ўнутраным водным транспартам агульнага карыстання, публікуецца ў парадку, ўстаноўленым рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

**Артыкул 103. Дагавор аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам**

Пры неабходнасці выканання сістэматычных перавозак пасажыраў перавозчык можа заключаць з любымі асобамі доўгатэрміновыя дагаворы аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам.

Дагавор аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам заключаецца ў пісьмовай форме.

У дагаворы аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам вызначаюцца маршрут, расклад руху, колькасць рэйсаў, тэрміны і іншыя ўмовы давання транспартных сродкаў для перавозкі ўнутраным водным транспартам, парадак разлікаў, адказнасць бакоў, а таксама іншыя ўмовы арганізацыі перавозак.

Дагавор аб арганізацыі перавозак пасажыраў унутраным водным транспартам не выключае неабходнасці заключэння ва ўстаноўленым парадку дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам.

**Артыкул 104. Правазная плата**

За перавозку пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам спаганяецца правазная плата, устаноўленая пагадненнем бакоў, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

Плата за перавозку пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам агульнага карыстання вызначаецца на падставе тарыфаў, якія зацвярджаюцца ў парадку, устаноўленым Правіламі перавозак пасажыраў і багажу і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлены льготы або перавагі па правазной плаце за перавозку пасажыраў і

багажу ўнутраным водным транспартам, панесеныя ў сувязі з гэтым выдаткі кампенсуюцца транспартнай арганізацыі за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту.

**Артыкул 105. Выключаны**

**Артыкул 106. Абавязкі і правы перавозчыка**

Перавозчык абавязаны:

падрыхтаваць судна для бяспечнага плавання, укамплектаваць яго экіпажам і забяспечыць усім неабходным для перавозкі пасажыраў;

заключыць дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі да ажыццяўлення перавозак;

даць грамадзянам у пунктах адпраўлення ў нагляднай і даступнай форме поўную і дакладную інфармацыю аб арганізацыі перавозак пасажыраў і багажу ўнутраным водным транспартам;

арганізаваць на вакзалах у залежнасці ад аб'ёмаў перавозак пасажыраў работу даведачных службаў, камер захоўвання, пакояў адпачынку і іншых службаў, прадугледжаных Правіламі перавозак пасажыраў і багажу;

забяспечыць на прыгарадных маршрутах і пераправах, дзе няма пасажырскіх памяшканняў, наяўнасць прычалаў, абсталяваных неабходнымі прыладамі для бяспечнай пасадкі і высадкі пасажыраў;

арганізаваць продаж білетаў, у тым ліку папярэдні, у адпаведнасці з Правіламі перавозак пасажыраў і багажу;

даць пасажыру ўказанае ў білеце або пуцёўцы месца на судне. Білет або пуцёўка, выдадзеныя на імя пэўнай асобы, не могуць быць перададзены іншай асобе. Парадак давання месца на судне асобным катэгорыям грамадзян, якім у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадугледжаны льготы на праезд унутраным водным транспартам, устанаўліваецца Правіламі перавозак пасажыраў і багажу;

забяспечыць пасажырам умовы праезду, устаноўленыя тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі і іншымі абавязковымі нарматывамі, у адпаведнасці з камфартабельнасцю судна, а таксама катэгорыяй пасажырскіх месцаў;

у выпадку, калі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту, да пачатку перавозкі пасажыраў унутраным водным транспартам, якая прадугледжвае перасячэнне пасажырамі Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь (далей – міжнародная перавозка пасажыраў), пераканацца ў тым, што пасажыры маюць дакументы, неабходныя для ўезду ў Рэспубліку Беларусь.

Пры ажыццяўленні міжнароднай перавозкі пасажыраў перавозчык мае права правяраць у пасажыраў дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

**Артыкул 107. Правы і абавязкі пасажыра**

Пасажыр мае права:

набыць білет на месца любой катэгорыі для праезду па ўнутраных водных шляхах да любога порта (пункта), указанага ў раскладзе або аб'яўленага па маршруце руху судна;

правозіць з сабой бясплатна адно дзіця ва ўзросце да пяці гадоў, а ў прыгарадных зносінах – не старэйшае за сем гадоў, калі яно не займае асобнага месца;

правозіць з сабой з аплатай 50 працэнтаў кошту праезду дзяцей ва ўзросце ад пяці да дзесяці гадоў уключна, а ў прыгарадных зносінах – ад сямі да дзесяці гадоў уключна;

правозіць з сабой бясплатна ручную паклажу агульнай вагой не больш за 36 кілаграмаў, а на хуткасных суднах – не больш за 20 кілаграмаў;

зрабіць прыпынак на шляху руху да 10 сутак з афармленнем яго ў білеце ў парадку, устаноўленым Правіламі перавозак пасажыраў і багажу;

працягваць тэрмін дзеяння білета ў выпадку хваробы, пацверджанай дакументам лячэбнай установы, або здаць білет у парадку, устаноўленым Правіламі перавозак пасажыраў і багажу, і атрымаць назад правазную плату за вылікам устаноўленага збору;

да адыходу судна ў любы час, а пасля пачатку рэйса ў любым пункце прыпынку судна адмовіцца ад дагавора перавозкі ўнутраным водным транспартам, здаць білет і атрымаць назад плату за праезд і правоз багажу ў парадку, памерах і тэрміны, устаноўленыя Правіламі перавозак пасажыраў і багажу;

адмовіцца ад перавозкі ўнутраным водным транспартам з-за затрымкі адпраўлення судна і атрымаць назад правазную плату ў поўным аб'ёме.

Пасажыр абавязаны:

выконваць правілы карыстання суднамі ўнутранага воднага транспарту, а таксама іншымі аб'ектамі, размешчанымі на беразе і прызначанымі для абслугоўвання пасажыраў;

на патрабаванне перавозчыка, які ажыццяўляе міжнародную перавозку пасажыраў, прад'яўляць яму дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

### Артыкул 108. Выключаны

### Артыкул 109. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам

Перавозчык мае права ў аднабаковым парадку адмовіцца ад выканання дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам, затрымаць адпраўленне судна, змяніць маршрут перавозкі або пункт высадкі пасажыра ў выпадках:

неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі, якая пагражае жыццю або здароўю людзей, з'яў стыхійнага характару, катастрофы або ваенных дзеянняў;

недаступнасці пункта адпраўлення або пункта прызначэння судна (блакада, аварыя, мелкаводдзе);

гібелі судна або яго гвалтоўнага захопу;

парушэння пасажырам Правіл перавозак пасажыраў і багажу;

адмовы пасажыра прад'явіць перавозчыку, які ажыццяўляе міжнародную перавозку пасажыраў, дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту;

парушэння пасажырам правіл, устаноўленых кампетэнтнымі органамі замежнай дзяржавы, якая з'яўляецца дзяржавай адпраўлення, прызначэння або транзіту, у адпаведнасці з заканадаўствам гэтай дзяржавы (пры ажыццяўленні міжнароднай перавозкі пасажыраў);

наяўнасці ў перавозчыка, які ажыццяўляе міжнародную перавозку пасажыраў, звестак аб тым, што пасажыру будзе адмоўлена ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь, калі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту.

Пры спыненні дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам да адыходу судна пасажыру вяртаецца кошт праезду і кошт правозу багажу, а пры спыненні гэтага дагавора пасля пачатку рэйса – частка яго ў памеры, прапарцыянальным адлегласці, не пройдзенай суднам. У выпадках, калі адмова перавозчыка ад выканання дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам выклікана дзеяннямі пасажыра, якія ствараюць пагрозу бяспекі суднаходства, жыццю і здароўю іншых пасажыраў, а таксама невыкананнем распараджэнняў капітана судна, плата за праезд пасажыра і правоз багажу не вяртаецца.

У выпадках, прадугледжаных абзацамі другім, трэцім і чацвёртым часткі першай гэтага артыкула, перавозчык абавязаны за свой кошт даставіць пасажыра па яго патрабаванні ў пункт адпраўлення або любы іншы найбліжэйшы пункт.

**Артыкул 110. Незапатрабаваны багаж**

Багаж, не запатрабаваны на працягу трох месяцаў з дня прыходу судна ў порт прызначэння, можа быць рэалізаваны перавозчыкам у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Прад'яўнік багажнай квітанцыі на працягу тэрміну іскавай даўнасці мае права атрымаць суму, выручаную перавозчыкам у адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула, за вылікам выдаткаў, панесеных перавозчыкам пры захоўванні незапатрабаванага багажу і яго рэалізацыі.

## ГЛАВА 12
## АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, БУКСІРОЎШЧЫКА, ГРУЗААДПРАЎШЧЫКА, ГРУЗААТРЫМАЛЬНІКА І ПАСАЖЫРА ПРЫ ПЕРАВОЗКАХ УНУТРАНЫМ ВОДНЫМ ТРАНСПАРТАМ

**Артыкул 111. Адказнасць па абавязацельствах пры перавозцы ўнутраным водным транспартам**

У выпадку нездзяйснення або неналежнага выканання абавязацельстваў па дагаворы перавозкі ўнутраным водным транспартам бакі нясуць адказнасць, устаноўленую гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама пагадненнем бакоў.

Пагадненні перавозчыкаў з пасажырамі і грузаўладальнікамі аб ліквідацыі або абмежаванні ўстаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адказнасці несапраўдныя, за выключэннем выпадкаў, калі магчымасць такіх пагадненняў пры перавозцы грузаў унутраным водным транспартам прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 112. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю або здароўю пасажыра**

Перавозчык нясе адказнасць за шкоду, прычыненую жыццю або здароўю пасажыра пры перавозцы ўнутраным водным транспартам, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Дагаворам перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам можа прадугледжвацца павышаная адказнасць перавозчыка ў параўнанні з адказнасцю, прадугледжанай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 113. Адказнасць перавозчыка за затрымку адпраўлення або спазненне прыбыцця пасажырскага судна ў пункт прызначэння

За затрымку адпраўлення судна, якое перавозіць пасажыра, або спазненне прыбыцця яго ў пункт прызначэння (за выключэннем перавозак унутраным водным транспартам агульнага карыстання ў гарадскіх і прыгарадных зносінах) перавозчык на патрабаванне пасажыра выплачвае яму няўстойку ў памеры 6 працэнтаў кошту праезду за кожную гадзіну затрымкі, але не большую за 30 працэнтаў кошту праезду, калі не дакажа, што затрымка або спазненне судна мелі месца з прычыны непераадольнай сілы, ліквідацыі няспраўнасцей судна, якія пагражаюць жыццю або здароўю пасажыра, або іншых абставін, якія не залежаць ад перавозчыка.

### Артыкул 114. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за пратэрміноўку дастаўкі грузу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта

За пратэрміноўку дастаўкі грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта перавозчык (буксіроўшчык) выплачвае няўстойку ў памеры 6 працэнтаў правазной платы за кожныя суткі пратэрміноўкі, але не большую за 30 працэнтаў правазной платы, калі не дакажа, што пратэрміноўка адбылася з прычыны абставін, якія перавозчык (буксіроўшчык) не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

### Артыкул 115. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за непадачу суднаў і кантэйнераў. Адказнасць грузаадпраўшчыка за невыкарыстанне пададзеных суднаў

За непадачу перавозчыкам (буксіроўшчыкам) суднаў і кантэйнераў для выканання перавозак або буксіроўкі ўнутраным водным транспартам, невыкарыстанне грузаадпраўшчыкам пададзеных суднаў і кантэйнераў або непрад'яўленне грузаў, буксаваных суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў выплачваецца няўстойка:

пры перавозцы грузаў у суднах і буксіроўцы суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў – у памеры 0,1 базавай велічыні за кожную тону грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта;

пры перавозцы грузаў у кантэйнерах – у памеры 0,5 базавай велічыні за кожны кантэйнер масай (брута) да 5 тон уключна, адной базавай велічыні за кожны кантэйнер масай (брута) ад 5 да 10 тон уключна, дзвюх базавых велічынь за кожны кантэйнер масай (брута) больш за 10 тон.

### Артыкул 116. Адказнасць перавозчыка (буксіроўшчыка) за захаванасць грузу, багажу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта

Перавозчык (буксіроўшчык) нясе адказнасць за захаванасць грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта з моманту прыёму іх да перавозкі (буксіроўкі) і да моманту выдачы грузаатрымальніку або атрымальніку ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, калі не дакажа, што

страта, недастача або пашкоджанне (псута) грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта адбыліся з прычыны абставін, якія перавозчык (буксіроўшчык) не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

Грузаадпраўшчык, грузаатрымальнік, адпраўшчык і атрымальнік багажу мае права лічыць груз, багаж, буксаванае судна, плыт або іншы плывучы аб'ект страчанымі і патрабаваць пакрыцця ўрону за іх страту, калі яны не выдадзены грузаатрымальніку або атрымальніку на працягу 30 каляндарных дзён пасля сканчэння тэрміну дастаўкі.

Калі груз, багаж, буксаванае судна, плыт або іншы плывучы аб'ект прыбылі ў пункт прызначэння пасля сканчэння ўказанага ў частцы другой гэтага артыкула тэрміну, грузаатрымальнік або атрымальнік абавязаны прыняць груз, багаж, буксаванае судна, плыт або іншы плывучы аб'ект і вярнуць заплачаную перавозчыкам (буксіроўшчыкам) суму за іх страту.

### Артыкул 117. Пакрыццё ўрону за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) грузу, багажу, буксаванага судна, плыта і іншага плывучага аб'екта

Урон, прычынены пры перавозцы грузу або багажу, кампенсуецца перавозчыкам (буксіроўшчыкам) у выпадках:

страты або недастачы грузу або багажу – у памеры кошту страчанага або адсутнага грузу або багажу;

пашкоджання (псуты) грузу або багажу – у памеры сумы, на якую панізіўся кошт грузу або багажу, а пры немагчымасці аднаўлення пашкоджанага грузу або багажу – у памеры іх кошту;

страты грузу або багажу, здадзеных для перавозкі ўнутраным водным транспартам з аб’яўленнем іх цэннасці, – у памеры аб'яўленага кошту грузу або багажу.

Кошт грузу або багажу вызначаецца зыходзячы з іх кошту, указанага ў рахунку прадаўца або прадугледжанага дагаворам, а пры адсутнасці рахунка або ўказання кошту ў дагаворы – зыходзячы з кошту, які пры параўнальных абставінах звычайна спаганяецца за аналагічныя тавары.

Нароўні з пакрыццём кошту страчанага, адсутнага або пашкоджанага (сапсаванага) грузу або багажу перавозчыкам (буксіроўшчыкам) кампенсуецца ўнесеная за перавозку дадзенага грузу або багажу правазная плата, калі яна не ўваходзіць у кошт грузу або багажу.

Пры пашкоджанні плыта па віне судна, якое буксіруе, буксіроўшчык аплачвае ўладальніку плыта кошт работ для яго аднаўлення і кошт страчанага такелажу.

Пры пашкоджанні буксаванага судна або іншага плывучага аб'екта па віне судна, якое буксіруе, з буксіроўшчыка спаганяецца кошт іх рамонту, які вызначаецца ўладальнікам буксаванага судна або іншага плывучага аб'екта, а ў выпадку рознагалоссяў па кошце рамонту – экспертызай, якую праводзіць арганізацыя, упаўнаважаная рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

У выпадку гібелі буксаванага судна або іншага плывучага аб'екта па віне судна, якое буксіруе, з буксіроўшчыка спаганяецца астаткавы кошт буксаванага судна або іншага плывучага аб'екта за вылікам з яго сумы, якую можна атрымаць ад рэалізацыі часткі, якая засталася ад судна або іншага плывучага аб'екта.

### Артыкул 118. Вызваленне перавозчыка (буксіроўшчыка) і грузаадпраўшчыка ад адказнасці

Перавозчык (буксіроўшчык) і грузаадпраўшчык вызваляюцца ад адказнасці, прадугледжанай артыкуламі 114 і 115 гэтага Кодэкса, калі невыкананне іх абавязацельстваў адбылося з прычыны:

непераадольнай сілы або ваенных дзеянняў;

спынення або абмежавання перавозкі грузаў унутраным водным транспартам у пэўных напрамках у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

ратавання жыцця людзей або маёмасці на вадзе;

іншых выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Перавозчык (буксіроўшчык) вызваляецца ад адказнасці, прадугледжанай артыкулам 116 гэтага Кодэкса, у выпадках:

непераадольнай сілы або ваенных дзеянняў;

ратавання жыцця людзей на вадзе;

скрытых недахопаў тары, грузу або яго ўласцівасцей;

розніцы ў масе грузу ў межах норм натуральнай страты, зніжэння вільготнасці і разыходжання норм у паказаннях вагавых прыбораў, а таксама розніцы ў масе грузу, прынятага для перавозкі зыходзячы з масы, вызначанай грузаадпраўшчыкам без удзелу перавозчыка;

дастаўкі грузу на спраўным судне са спраўнымі запорна-пламбіровачнымі прыладамі або ў суправаджэнні прадстаўніка грузаадпраўшчыка, грузаатрымальніка без запорна-пламбіровачных прылад пры наяўнасці аб гэтым пазнакі ў канасаменце.

### Артыкул 119. Адказнасць грузаадпраўшчыка і грузаатрымальніка пры перавозках унутраным водным транспартам

За няправільнае ўказанне ў канасаменце наймення грузу, неабходных мер засцярогі, уласцівасцей грузу, а таксама за адпраўленне забароненага для перавозкі ўнутраным водным транспартам грузу з грузаадпраўшчыка спаганяецца няўстойка ў памеры пяцікратнай правазной платы за перавозку такога грузу на ўсю адлегласць перавозкі незалежна ад пакрыцця страт перавозчыка (буксіроўшчыка), звязаных з дадзенымі абставінамі.

За звышнарматыўны прастой суднаў і затрымку кантэйнераў з грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка спаганяецца плата, памер якой вызначаецца пагадненнем бакоў.

За несвоечасовую аплату перавозкі ўнутраным водным транспартам з грузаадпраўшчыка спаганяецца няўстойка ў памеры аднаго працэнта незаплачанай сумы за кожны дзень пратэрміноўкі незалежна ад платы за звышнарматыўны прастой судна па гэтай прычыне.

У выпадку ўтварэння запазычанасці па аплаце перавозкі грузу ўнутраным водным транспартам, дастаўленага ў пункт прызначэння, выдача яго можа быць затрымана, калі гэта не прывядзе да пашкоджання грузу, да ўнясення ўсіх выплат, уключаючы няўстойку за пратэрміноўку выплаты, або да давання на гэтыя сумы гарантый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

За неачыстку суднаў або кантэйнераў пасля іх разгрузкі грузаўладальнік абавязаны аплаціць перавозчыку кошт работ па ачыстцы ў двухкратным памеры.

Перавозчык мае права адмовіцца ад перастаноўкі на прычале неачышчанага судна або кантэйнера да выканання грузаўладальнікам работ па іх ачыстцы са спагнаннем платы за звышнарматыўны прастой судна або кантэйнера.

За пагрузку грузу без ведама перавозчыка грузаадпраўшчык абавязаны выплаціць поўны кошт перавозкі такога грузу ад пункта пагрузкі да пункта яго выгрузкі і няўстойку ў такім жа памеры.

За пашкоджанне судна, кантэйнера або сродкаў пакетавання грузаў з грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка спаганяецца кошт неабходнага рамонту.

### Артыкул 120. Адказнасць за шкоду ад забруджвання з судна нафтай або іншымі рэчывамі

Суднаўладальнік нясе адказнасць за шкоду ад забруджвання, прычыненую з прычыны ўцечкі з судна або скіду з яго нафты ці іншых рэчываў.

Суднаўладальнік не нясе адказнасці, прадугледжанай гэтым артыкулам, калі дакажа, што шкода прычынена з-за непераадольнай сілы, а таксама іншых з'яў стыхійнага характару (пажараў, навадненняў), няспраўнасці сродкаў навігацыйнага абсталявання ўнутраных водных шляхоў або ваенных дзеянняў.

Калі суднаўладальнік дакажа, што шкода ад забруджвання з судна нафтай і іншымі рэчывамі поўнасцю або часткова ўзнікла па віне пацярпелай асобы, то ў залежнасці ад ступені яе віны памер пакрыцця шкоды павінен быць зніжаны або ў пакрыцці шкоды можа быць адмоўлена.

Калі шкода ад забруджвання выклікана ўцечкай або скідам забруджвальных рэчываў больш чым з аднаго судна, суднаўладальнікі нясуць адказнасць за гэту шкоду прапарцыянальна ступені віны кожнага з іх, калі не дакажуць, што маюць права на вызваленне ад адказнасці. Калі шкода не можа быць абгрунтавана падзелена паміж суднаўладальнікамі, яны нясуць салідарную адказнасць.

### Артыкул 121. Адказнасць пасажыра пры перавозцы ўнутраным водным транспартам

Пасажыр нясе адказнасць за шкоду, прычыненую перавозчыку, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 13
## БЯСПЕКА СУДНАХОДСТВА СУДНАЎ УНУТРАНАГА ПЛАВАННЯ, СУДНАЎ ЗМЕШАНАГА (РАКА – МОРА) ПЛАВАННЯ

### Артыкул 122. Агульныя палажэнні аб бяспецы суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання

У мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання суднаўладальнік абавязаны:

прызначыць асобу, адказную за бяспечную эксплуатацыю суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання;

забяспечваць бяспечную эксплуатацыю суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання;

пастаянна паляпшаць навыкі членаў экіпажаў суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, іншых работнікаў у галіне забеспячэння бяспекі суднаходства;

забяспечваць укамплектаванне экіпажаў суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання і падтрымліваць гэтыя судны ў тэхнічным стане, які адпавядае патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне бяспекі суднаходства.

За незабеспячэнне бяспекі суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання суднаўладальнік нясе адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Абавязкам суднаўладальніка з'яўляецца падрыхтоўка судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання да плавання.

Судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання лічацца прыдатнымі да плавання, калі яны ўкамплектаваны экіпажам і адпавядаюць патрабаванням забеспячэння бяспекі суднаходства, а таксама прыродаахоўным, санітарным, супрацьпажарным і іншым патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 123. Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання**

Судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання падлягаюць тэхнічнаму нагляду і класіфікацыі органам, упаўнаважаным Урадам Рэспублікі Беларусь (далей – класіфікацыйная арганізацыя).

Судна, якое плавае пад замежным сцягам, пры заходзе на ўнутраныя водныя шляхі Рэспублікі Беларусь можа быць падвергнута агляду на роўных падставах з суднамі, якія плаваюць пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

Тэхнічны нагляд і класіфікацыя суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ажыццяўляюцца за кошт суднаўладальнікаў.

**Артыкул 124. Кантроль за бяспекай суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь**

Кантроль за бяспекай суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца органам па бяспецы суднаходства.

Орган па бяспецы суднаходства мае права:

рабіць агляд суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, плывучых аб'ектаў, а таксама збудаванняў, якія знаходзяцца на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

затрымліваць судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання і плывучыя аб'екты, якія не адпавядаюць патрабаванням забеспячэння бяспекі суднаходства;

прыпыняць і забараняць рух суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання і плывучых аб'ектаў у выпадку пагрозы бяспецы суднаходства;

расследаваць і класіфікаваць транспартныя аварыйныя выпадкі з суднамі ўнутранага плавання, суднамі змешанага (рака – мора) плавання, якія эксплуатуюцца на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

праводзіць дзяржаўную рэгістрацыю суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ў Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі

Беларусь, выдачу пасведчанняў аб праве плавання пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь і пасведчанняў аб праве ўласнасці на судна;

правяраць веды і ўдзельнічаць у дыпламаванні асоб каманднага саставу судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання;

ажыццяўляць нагляд за належным утрыманнем суднавых хадоў і сродкаў навігацыйнага абсталявання;

рабіць праверку гатоўнасці суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання да выхаду ў міжнародныя рэйсы.

**Артыкул 125. Дзяржаўны пажарны нагляд і кантроль за станам пажарнай бяспекі**

Дзяржаўны пажарны нагляд на суднах унутранага плавання, за выключэннем тых, якія знаходзяцца ў дарозе, ажыццяўляецца органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду.

Кантроль за станам пажарнай бяспекі на суднах унутранага плавання ажыццяўляецца суднаўладальнікамі.

**Артыкул 126. Забеспячэнне экалагічнай бяспекі суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання. Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва**

Суднаўладальнік абавязаны забяспечваць экалагічную бяспеку суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, недапушчэнне забруджвання з суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання воднага асяроддзя гаспадарча-бытавымі водамі і адходамі, нафтай, нафтапрадуктамі і іншымі рэчывамі, шкоднымі для здароўя людзей і жывёльнага свету вадаёмаў. Абсталяванне суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання адпаведнымі тэхнічнымі сродкамі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове навакольнага асяроддзя.

Пры адсутнасці абсталявання, прылад для прыёму, перапрацоўкі і ачысткі гаспадарча-бытавых і нафтазмяшчальных вод і адходаў, а таксама для збору з паверхні вады нафтапрадуктаў у выпадку аварыйных разліваў іх з суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання суднаўладальнік заключае дагавор на выкананне гэтых работ са спецыялізаванымі арганізацыямі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Тэхнічны нагляд за экалагічнай бяспекай суднаў унутранага плавання і суднаў змешанага (рака – мора) плавання ажыццяўляе класіфікацыйная арганізацыя.

Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем арганізацыямі ўнутранага воднага транспарту заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва пры вядзенні транспартнай дзейнасці выконваюць вызначаныя Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь органы і ўстановы, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд.

Патрабаванні да суднаўладальнікаў па забеспячэнні экалагічнай бяспекі суднаходства суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ўстанаўліваюцца Правіламі прадухілення забруджвання ўнутраных водных шляхоў

сцёкавымі і нафтазмяшчальнымі водамі з суднаў, якія зацвярджаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту пасля ўзгаднення з рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 127. Лоцманская праводка суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання**

На асобных участках унутраных водных шляхоў і для суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання пэўных тыпаў і памераў рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту можа ўстанаўлівацца лоцманская праводка суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, у тым ліку абавязковая.

Парадак арганізацыі лоцманскай праводкі суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ўстанаўліваецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Паслугі лоцманскай праводкі суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ажыццяўляюцца на аплатнай аснове.

Усе судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання замежных дзяржаў пры руху па ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь падлягаюць абавязковай лоцманскай праводцы, калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

Лоцманскую праводку суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ажыццяўляюць лоцманы, якія маюць выдадзеныя ва ўстаноўленым парадку лоцманскія пасведчанні. Лоцман, які прыбыў на судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання, абавязаны прад'явіць капітану (камандзіру) судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання лоцманскае пасведчанне. Капітан (камандзір) судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання мае права не браць на судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання ў якасці лоцмана асобу, якая не мае лоцманскага пасведчання.

Прысутнасць на судне ўнутранага плавання, судне змешанага (рака – мора) плавання лоцмана не здымае з капітана (камандзіра) судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання адказнасці за кіраванне суднам унутранага плавання, суднам змешанага (рака – мора) плавання. Пры наяўнасці дастатковых падстаў сумнявацца ў правільнасці рэкамендацый лоцмана капітан (камандзір) судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання ў мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства мае права адмовіцца ад яго паслуг. У выпадку, калі лоцманская праводка з'яўляецца абавязковай, капітан (камандзір) судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання павінен запатрабаваць замены лоцмана.

Адказнасць за ўрон, прычынены лоцманам уладальніку судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання, які карыстаецца паслугамі лоцмана, нясе рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў, з якім лоцман заключыў працоўны дагавор, калі будзе даказана, што ўрон прычынены па віне лоцмана.

**Артыкул 128. Затанулая маёмасць**

Пад затанулай маёмасцю разумеюцца:

судны і плывучыя аб'екты;

абсталяванне, грузы, абломкі збудаванняў і іншыя прадметы,

якія апынуліся на плаву пад паверхняй вады, апусціліся на дно вадаёма або былі выкінутыя на мелкаводдзе або бераг.

Ступень пагрозы, якая ствараецца затанулай маёмасцю для бяспекі суднаходства, вызначаюць рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы ўнутраных водных шляхоў з удзелам органа па бяспецы суднаходства.

Уладальнік затанулых судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання або судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання, якія перавозілі затанулую маёмасць або ажыццяўлялі буксіроўку затанулага судна ўнутранага плавання, судна змешанага (рака – мора) плавання або іншага плывучага аб'екта, а таксама ўладальнік іншай затанулай маёмасці, указанай у частцы першай гэтага артыкула, абавязаны неадкладна паведаміць рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству ўнутраных водных шляхоў, органу па бяспецы суднаходства і ўладальніку затанулай маёмасці аб факце здарэння, яго прычынах, часе і месцы.

**Артыкул 129. Пад’ём затанулай маёмасці**

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў на працягу пяці каляндарных дзён з дня атрымання паведамлення аб затанулай маёмасці вызначае парадак яе пад’ёму і тэрмін, дастатковы ў абставінах, якія склаліся, для яе пад’ёму, выдалення і (або) знішчэння, аб чым паведамляе ўласніку маёмасці.

Пад знішчэннем затанулай маёмасці разумеецца любое неабходнае для гэтай мэты яго разбурэнне або магчымае заглыбленне ніжэй дна вадаёма.

Пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці ў тэрмін, устаноўлены ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула, з'яўляюцца абавязкам асобы, вінаватай у затапленні маёмасці, а пры яе адсутнасці – абавязкам уласніка затанулай маёмасці.

Калі пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці не ажыццёўлена ў вызначаныя тэрміны, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў мае права ажыццявіць іх самастойна за кошт асобы, абавязкам якой з'яўляюцца пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці.

Калі асоба, абавязкам якой з'яўляюцца пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці, на працягу аднаго года з дня атрымання паведамлення аб затанулай маёмасці не кампенсуе ў добраахвотным парадку рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству ўнутраных водных шляхоў выдаткі, звязаныя з яе пад’ёмам, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў мае права:

рэалізаваць паднятую затанулую маёмасць або яе частку ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і за кошт сумы, выручанай ад рэалізацыі, кампенсаваць свае выдаткі на пад’ём маёмасці, а таксама іншыя панесеныя ў сувязі з гэтым выдаткі;

атрымаць ад асобы, абавязкам якой з'яўляюцца пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці, пакрыццё выдаткаў, якія не пакрываюцца сумай, выручанай ад рэалізацыі, а пры знішчэнні затанулай маёмасці – пакрыццё панесеных у сувязі з гэтым расходаў.

У выпадку, калі затанулая маёмасць стварае непасрэдную пагрозу бяспецы суднаходства і (або) прычынення значнага ўрону навакольнаму асяроддзю, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў абавязана прыняць тэрміновыя меры па яе пад’ёме, выдаленні і (або) знішчэнні.

Затанулая маёмасць, паднятая ў адпаведнасці з часткай шостай гэтага артыкула, можа быць выпатрабавана яе ўласнікам пасля пакрыцця ім выдаткаў на пад'ём затанулай маёмасці і іншых панесеных у сувязі з гэтым выдаткаў, у тым ліку расходаў, звязаных з прычыненнем шкоды навакольнаму асяроддзю, пры ўмове, калі з моманту пад'ёму затанулай маёмасці прайшло не больш за адзін год.

Пад'ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці кантралюе рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства ўнутраных водных шляхоў.

Правілы гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на затанулыя ваенную маёмасць і любыя паветраныя судны, пад'ём, выдаленне і (або) знішчэнне якіх ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Арганізацыя, якая ажыццяўляе пад'ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулых ваеннай маёмасці і паветраных суднаў, павінна ўзгадняць свае дзеянні з рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам унутраных водных шляхоў і тэрытарыяльнымі органамі дзяржаўнага кіравання па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя.

У выпадку, калі пад'ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулай маёмасці ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам, разглядаюцца як выратавальная аперацыя, гэтыя правілы прымяняюцца ў дачыненні да ўзнагароджання і спецыяльнай кампенсацыі асобам, якія аказалі дапамогу, незалежна ад правіл, устаноўленых гэтым артыкулам.

Пры пад'ёме, выдаленні і (або) знішчэнні затанулай маёмасці павінны прымацца меры, якія папярэджваюць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

**Артыкул 130. Пакрыццё шкоды, прычыненай сутыкненнем суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання**

Пры сутыкненні суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання шкода, прычыненая жыццю і здароўю людзей, навакольнаму асяроддзю, а таксама ўрон, прычынены суднам унутранага плавання, суднам змешанага (рака – мора) плавання, грузам або іншай маёмасці, кампенсуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 13[1]
## БЯСПЕКА СУДНАХОДСТВА МАЛАМЕРНЫХ СУДНАЎ. ЭКСПЛУАТАЦЫЯ ГЭТЫХ СУДНАЎ І БАЗ (ЗБУДАВАННЯЎ) ДЛЯ ІХ СТАЯНАК

**Артыкул 130[1]. Бяспека суднаходства маламерных суднаў, бяспечная эксплуатацыя гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак**

Бяспеку суднаходства маламерных суднаў, а таксама бяспечную эксплуатацыю гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак забяспечваюць адпаведна суднаўладальнікі маламерных суднаў, суднавадзіцелі, эксплуатанты такіх баз (збудаванняў).

У галіне забеспячэння бяспекі суднаходства маламерных суднаў, а таксама бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на водных аб'ектах Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах ажыццяўляе:

кантроль за бяспекай суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, а таксама за эксплуатацыяй гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўную рэгістрацыю і класіфікацыю, тэхнічны агляд маламерных суднаў, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю менш за 225 кілаграмаў;

рэгістрацыю баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў;

арганізацыю навучання грамадзян правілам кіравання маторнымі маламернымі суднамі;

праверку ведаў грамадзянамі правіл кіравання маторнымі маламернымі суднамі;

выдачу, абмен,ануляванне і адабранне пасведчанняў на права кіравання маторнымі маламернымі суднамі, а таксама выдачу іх дублікатаў;

выдачу, абмен,ануляванне і адабранне міжнародных пасведчанняў на права кіравання прагулачным суднам, а таксама выдачу іх дублікатаў;

устанаўленне ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, забароны на эксплуатацыю маламерных суднаў;

устанаўленне ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, забароны на эксплуатацыю баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў;

агляд (абследаванне) маламерных суднаў на прадмет адпаведнасці іх тэхнічнага стану, аснашчэння і афармлення патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

абследаванне тэхнічнага стану баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў;

расследаванне транспартных аварыйных выпадкаў з удзелам маламерных суднаў.

Апрача мерапрыемстваў, указаных у частцы другой гэтага артыкула, у галіне забеспячэння бяспекі суднаходства маламерных суднаў, а таксама бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на водных аб'ектах Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах удзельнічае ў рэалізацыі мерапрыемстваў для папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару на водных аб'ектах, а таксама ў пошуку і ратаванні людзей на водных аб'ектах.

**Артыкул 130$^{2}$. Тэхнічны агляд маламерных суднаў**

Маламерныя судны, за выключэннем вёславых лодак, байдарак і надзіманых суднаў грузападымальнасцю менш за 225 кілаграмаў, якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю, падлягаюць тэхнічнаму агляду.

Тэхнічны агляд маламерных суднаў ажыццяўляе Дзяржаўная інспекцыя па маламерных суднах. Парадак і перыядычнасць тэхнічнага агляду маламерных суднаў вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных працэдурах.

**Артыкул 130$^{3}$. Забарона на эксплуатацыю маламернага судна, базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў**

Забараняецца эксплуатацыя маламернага судна ў выпадку:

неадпаведнасці яго патрабаванням да эксплуатацыйнага стану маламерных суднаў;

калі яно ва ўстаноўленым парадку не прайшло дзяржаўную рэгістрацыю і класіфікацыю і (або) тэхнічны агляд;

у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Забараняецца эксплуатацыя базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў у выпадку:

калі яна ва ўстаноўленым парадку не прайшла рэгістрацыю;

неадпаведнасці яе патрабаванням да эксплуатацыйнага стану баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

калі яе тэхнічны стан пагражае бяспецы суднаходства, навакольнаму асяроддзю.

**Артыкул 130$^4$. Затанулае маламернае судна**

Уладальнік затанулага маламернага судна ў мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства абавязаны неадкладна паведаміць рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству ўнутраных водных шляхоў аб факце ўтаплення маламернага судна, яго прычынах, часе і месцы, а таксама забяспечыць пад’ём гэтага маламернага судна, яго выдаленне і (або) знішчэнне.

Пад’ём, выдаленне і (або) знішчэнне затанулага маламернага судна ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з нормамі артыкула 129 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 130$^5$. Правы і абавязкі службовых асоб Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах**

Службовыя асобы Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах пры выкананні службовых абавязкаў маюць права:

спыняць пры неабходнасці маламерныя судны, рабіць іх агляд (абследаванне), правяраць у суднавадзіцеляў дакумент, які сведчыць асобу, наяўнасць пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам або міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам, суднавага білета і сертыфіката аб допуску судна да эксплуатацыі;

забараняць у выпадках, прадугледжаных абзацамі другім і трэцім часткі першай артыкула 130$^3$ гэтага Кодэкса і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, эксплуатацыю маламерных суднаў;

забараняць у выпадках, прадугледжаных часткай другой артыкула 130$^3$ гэтага Кодэкса, эксплуатацыю баз (збудаванняў) для стаянак маламерных суднаў;

іншыя правы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Службовыя асобы Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах пры выкананні службовых абавязкаў абавязаны:

мець пры сабе і прад'яўляць службовае пасведчанне;

быць у форменным адзенні;

удзельнічаць у рэалізацыі мерапрыемстваў для папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару на водных аб'ектах, а таксама ў пошуку і ратаванні людзей на водных аб'ектах;

выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь, не дапускаць неабгрунтаванага абмежавання праў і свабод грамадзян, здзяйснення дзеянняў у мэтах знявагі гонару і годнасці чалавека і грамадзяніна;

аказваць дапамогу асобам, якія пацярпелі ад правапарушэнняў або няшчасных выпадкаў, а таксама якія знаходзіцца ў бездапаможным або іншым небяспечным для жыцця стане;

растлумачваць правапарушальнікам і іншым асобам прычыны і падставы мер па абмежаванні іх праў і свабод, якія прымяняюцца ў мэтах забеспячэння бяспекі суднаходства маламерных суднаў, а таксама права на іх абскарджанне, якое ўзнікае ў сувязі з гэтым;

выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 130$^6$. Садзейнічанне грамадзян у забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак**

У забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак маюць права удзельнічаць грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь могуць рэалізоўваць свае права на ўдзел у забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак у форме пазаштатнага супрацоўніцтва з Дзяржаўнай інспекцыяй па маламерных суднах.

Пазаштатнае супрацоўніцтва з Дзяржаўнай інспекцыяй па маламерных суднах рэалізуецца шляхам прыцягнення грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту і не знаходзяцца ў штаце Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах, да ўдзелу ў яе рабоце на добраахвотнай аснове пад непасрэдным кіраўніцтвам службовых асоб Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах. Парадак афармлення і дзейнасці пазаштатных супрацоўнікаў Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах устанаўлівае Урад Рэспублікі Беларусь.

Пазаштатнымі супрацоўнікамі Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах не могуць быць асобы:

якія не адпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным часткай трэцяй гэтага артыкула;

пазбаўленыя права кіравання маламернымі суднамі;

якія маюць судзімасць;

прызнаныя недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі.

Пазаштатным супрацоўнікам Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах выдаецца пасведчанне пазаштатнага супрацоўніка, узор якога ўстанаўлівае Урад Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 130[7]. Правы і абавязкі пазаштатных супрацоўнікаў Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах**

Пазаштатныя супрацоўнікі Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах пры выкананні функцый па забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак маюць права:

патрабаваць ад суднавадзіцеляў і іншых асоб выканання патрабаванняў па бяспецы суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак, спынення правапарушэнняў або дзеянняў, якія перашкаджаюць выкананню імі функцый пазаштатнага супрацоўніка;

садзейнічаць Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах у рэалізацыі ўскладзеных на яе задач, у тым ліку пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур.

Пазаштатныя супрацоўнікі Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах пры выкананні функцый па забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў і бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак абавязаны:

мець пры сабе і прад'яўляць пасведчанне пазаштатнага супрацоўніка;

выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь, не дапускаць неабгрунтаванага абмежавання праў і свабод грамадзян, здзяйснення дзеянняў у мэтах знявагі гонару і годнасці чалавека і грамадзяніна;

аказваць дапамогу асобам, якія пацярпелі ад правапарушэнняў або няшчасных выпадкаў, а таксама якія знаходзіцца ў бездапаможным або іншым небяспечным для жыцця стане;

у выпадках паступлення ім паведамленняў аб правапарушэннях або падзеях, якія пагражаюць бяспецы суднаходства маламерных суднаў, бяспечнай эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак, або непасрэднага выяўлення імі такіх

падзей прыняць меры для ратавання людзей, аховы месцаў здарэнняў і паведаміць аб здарэнні ў Дзяржаўную інспекцыю па маламерных суднах.

**Артыкул 130$^{8}$. Забеспячэнне экалагічнай бяспекі суднаходства маламерных суднаў і эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак. Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва**

Суднаўладальнік маламернага судна, суднавадзіцель, эксплуатант базы (збудавання) для стаянкі маламерных суднаў абавязаны забяспечваць экалагічную бяспеку суднаходства маламерных суднаў і эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак, недапушчэнне забруджвання і засмечвання вод з такіх судна, базы (збудавання).

Патрабаванні да суднаўладальнікаў маламерных суднаў, суднавадзіцеляў, эксплуатантаў баз (збудаванняў) для іх стаянак па забеспячэнні экалагічнай бяспекі суднаходства маламерных суднаў і эксплуатацыі гэтых суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак устанаўліваюцца патрабаваннямі да эксплуатацыйнага стану маламерных суднаў і баз (збудаванняў) для іх стаянак на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь, Правіламі прадухілення забруджвання ўнутраных водных шляхоў сцёкавымі і нафтазмяшчальнымі водамі з суднаў і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны санітарны нагляд за выкананнем суднаўладальнікамі маламерных суднаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва пад час транспартнай дзейнасці вядуць органы і ўстановы, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд.

**Артыкул 130$^{9}$. Лоцманская праводка маламерных суднаў**

На асобных участках унутраных водных шляхоў і для маламерных суднаў пэўных тыпаў і памераў рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту можа ўстанаўлівацца лоцманская праводка маламерных суднаў, у тым ліку абавязковая.

Парадак арганізацыі лоцманскай праводкі маламерных суднаў устанаўлівае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Лоцманская праводка маламерных суднаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нормамі артыкула 127 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 130$^{10}$. Пакрыццё шкоды, прычыненай сутыкненнем маламернага судна з іншым суднам**

Пры сутыкненні маламернага судна з іншым суднам шкода, прычыненая жыццю і здароўю людзей, навакольнаму асяроддзю, а таксама ўрон, прычынены суднам, грузам або іншай маёмасці, кампенсуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 14
## АГУЛЬНАЯ АВАРЫЯ

**Артыкул 131. Паняцце агульнай аварыі**

Агульнай аварыяй прызнаюцца страты, панесеныя з прычыны наўмысна і разумна праведзеных надзвычайных расходаў або ахвяраванняў у мэтах аховы судна і грузу ад агульнай для іх небяспекі, а таксама захавання правазной платы.

Агульная аварыя размяркоўваецца паміж суднам, грузам і правазной платай адпаведна з іх кантрыбуцыйным коштам, які вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 145 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 132. Прымяненне правіл, устаноўленых гэтай главой**

Правілы, устаноўленыя гэтай главой, за выключэннем правіл, устаноўленых артыкуламі 146–150 гэтага Кодэкса, прымяняюцца, калі пагадненнем бакоў не вызначана іншае.

У выпадку, прадугледжаным пагадненнем бакоў, а таксама ў выпадку непаўнаты падлеглага прымяненню закона пры вызначэнні роду аварыі, памераў агульнааварыйных страт і іх размеркаванні прымяняюцца правілы, устаноўленыя пагадненнем бакоў аб агульнай аварыі, і міжнародныя звычаі гандлёвага мараплаўства.

Права на пакрыццё страт у парадку размеркавання агульнай аварыі захоўваецца таксама і ў тым выпадку, калі падзея, якая прывяла да агульнай аварыі, узнікла па віне аднаго з удзельнікаў у агульнай справе. Аднак такое размеркаванне агульнай аварыі не пазбаўляе яе ўдзельнікаў права на спагнанне з адпаведнай асобы прычыненых ім страт.

**Артыкул 133. Заменныя выдаткі**

Любыя дадатковыя выдаткі, праведзеныя замест выдаткаў, што былі б аднесены да агульнай аварыі (заменныя выдаткі ), прызнаюцца агульнай аварыяй, але толькі ў межах расходаў, якіх такім чынам удалося пазбегнуць. Прызнаныя ў гэтым выпадку выдаткі зніжаюцца на суму выдаткаў, якія ўзніклі б пры нармальным ходзе плавання.

**Артыкул 134. Выключэнне ўскосных страт**

У агульную аварыю ўключаюцца толькі тыя страты, якія з'яўляюцца прамым вынікам акта агульнай аварыі.

Страты, выкліканыя затрымкай судна падчас рэйса, яго прастоем, змяненнем цэн, і іншыя ўскосныя страты не прызнаюцца агульнай аварыяй.

**Артыкул 135. Цяжар даказвання**

Бок, які патрабуе размеркавання агульнай аварыі, абавязаны даказаць, што заяўленыя страты сапраўды павінны быць прызнаны агульнай аварыяй.

**Артыкул 136. Пакрыццё выдаткаў на ратаванне**

Выдаткі на ратаванне ў выпадку, калі ратаванне ажыццяўлялася ў мэтах, указаных у частцы першай артыкула 131 гэтага Кодэкса, прызнаюцца агульнай аварыяй незалежна ад таго, ажыццяўлялася ратаванне на падставе дагавора або іншым чынам.

Выдаткі, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, уключаюць узнагароджанне за ратаванне, пры вызначэнні якога ўлічваюцца майстэрства і намаганні асоб, што дапамагалі прадухіць або змяншыць шкоду, якая прычыняецца навакольнаму асяроддзю. Аднак спецыяльная кампенсацыя, якая выплачваецца

суднаўладальнікам асобе, што аказала дапамогу, у памеры, прадугледжаным часткай чацвёртай артыкула 153 гэтага Кодэкса, не прызнаецца агульнай аварыяй.

### Артыкул 137. Частковая выгрузка грузу з аднаго судна і пагрузка яго на іншае судна

У выпадку, калі судна вымушана ажыццяўляць частковую выгрузку грузу з далейшым захоўваннем яго на беразе або іншым судне, да агульнай аварыі адносяцца:

выдаткі на частковую выгрузку грузу з судна, захоўванне і пагрузку яго назад на судна;

выдаткі на арэнду судна, на якое ажыццяўляецца частковая пагрузка грузу;

страты і выдаткі на ліквідацыю пашкоджанняў, панесеныя суднам, на якое ажыццяўлялася пагрузка грузу, а таксама страты, звязаныя з вывадам такога судна з эксплуатацыі;

выдаткі, выкліканыя пашкоджаннямі, узніклымі на пацярпелым аварыю судне падчас частковай выгрузкі з яго грузу і пагрузкі яго на іншае судна;

страты і выдаткі, звязаныя са стратай і пашкоджаннем грузу пры яго частковай выгрузцы, захоўванні і пагрузцы;

страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі), выплачаныя страхоўшчыкам за дадатковае страхаванне.

### Артыкул 138. Месца сховішча

Агульнай аварыяй прызнаюцца выдаткі на заход судна з грузам у порт або іншае месца сховішча з прычыны паводкі, ледаходу, раптоўнага і імклівага паніжэння ўзроўню вады ў межах унутраных водных шляхоў або іншых надзвычайных абставін, звязаных з неабходнасцю заходу судна ў порт або іншае месца сховішча, знаходжаннем яго ў порце або іншым месцы сховішча і выхадам судна з порта або іншага месца сховішча.

У выпадку, калі паводка або ледаход надышлі пасля заходу судна з грузам у порт выгрузкі і судна павінна пакінуць порт выгрузкі да яе заканчэння ў мэтах заходу ў іншы (бяспечны) порт, месцам сховішча будзе лічыцца іншы порт.

У выпадку, калі судна з прычыны паводкі або ледаходу не можа працягнуць рэйс і павінна застацца ў порце пасля выгрузкі грузу, прызначанага для гэтага порта, ён лічыцца месцам сховішча для такога судна толькі ў дачыненні да грузаў, прызначаных для іншых партоў.

### Артыкул 139. Караван суднаў

Пад караванам суднаў разумеецца група суднаў, злучаных паміж сабой такім чынам, што кожнае паасобку судна такой групы не можа ажыццяўляць рух самастойна.

У выпадку, калі былі праведзены дзеянні ў мэтах ажыццяўлення выратавальных аперацый у дачыненні да аднаго або некалькіх суднаў каравана і іх грузаў, якія знаходзяцца ў агульнай для іх небяспецы, прымяняюцца палажэнні, якія ўстаноўлены гэтай главой. Судна каравана не лічыцца суднам, якое знаходзіцца ў агульнай небяспецы разам з іншым суднам або некалькімі суднамі каравана, калі яно ў выніку аддзялення ад іншага судна або іншых суднаў можа быць ў бяспецы.

Пры вызначэнні кантрыбуцыйнага кошту каравана суднаў пад суднам і грузам разумеецца агульны кошт усіх суднаў каравана і грузаў, якія знаходзяцца ў агульнай небяспецы.

**Артыкул 140. Агульная аварыя, выкліканая пашкоджаннем машын, наўмыснай пасадкай на мель, пад’ёмам затанулага судна і пажарам на судне**

Агульнай аварыяй прызнаюцца выдаткі на ліквідацыю пашкоджанняў, якія ўзніклі ў выніку фарсіравання работы машын, а таксама пашкоджанняў рухача, рулявога, буксірнага і іншых прылад, якія ўзніклі пры спробе судна зняцца з мелі.

Агульнай аварыяй прызнаюцца страты ад пашкоджанняў, прычыненых судну і (або) грузу наўмыснай пасадкай судна на мель або наўмысным затапленнем яго.

У выпадку, калі судна з грузам з прычыны аварыі было затоплена, выдаткі на пад’ём судна з грузам і адпаведныя страты адносяцца да агульнай аварыі.

Прычыненыя судну і (або) грузу страты з прычыны пашкоджання судна і (або) грузу вадой або іншым чынам, у тым ліку страты ад выкідання судна на бераг або затаплення судна, якое гарыць, прызнаюцца агульнай аварыяй. Не кампенсуюцца страты, прычыненыя судну і (або) грузу з прычыны ўздзеяння дыму або награвання, якім бы чынам яны ні былі прычынены.

**Артыкул 141. Страты ад пашкоджання судна, яго машын і прылад або гібелі судна**

Страты ад пашкоджання судна, яго машын і прылад, якія складаюць агульную аварыю, вызначаюцца зыходзячы з кошту рамонту, выпраўлення або замены таго, што пашкоджана або страчана.

У выпадку, калі рамонт судна не праводзіўся, страты ад пашкоджання судна вызначаюцца ў суме, на якую кошт судна зменшыўся ў выніку пашкоджання і якая, згодна з каштарысам, не перавышае кошту рамонту судна.

У выпадку гібелі судна або ў выпадку, калі кошт ліквідацыі пашкоджанняў вышэйшы за кошт судна ў непашкоджаным стане, страты, якія прызнаюцца агульнай аварыяй, складаюць розніцу паміж ацэначным коштам судна ў непашкоджаным стане пасля выліку з яго ацэначнага кошту ліквідацыі пашкоджанняў, што не адносяцца да агульнай аварыі, і коштам судна ў пашкоджаным стане, які можа быць вызначаны чыстай выручкай ад рэалізацыі таго, што засталося ад судна.

У выпадку, калі пры рамонце судна старыя матэрыялы або часткі судна замяняюцца новымі, кошт рамонту, які адносіцца да агульнай аварыі, змяншаецца (скідкі «за новае замест старога») на:

адну пятую кошту корпуса судна, яго машын і прылад, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі ад двух да пяці гадоў на момант аварыі судна;

адну чацвёртую кошту корпуса судна, яго машын і прылад, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі ад шасці да дзесяці гадоў на момант аварыі судна;

адну трэцюю кошту корпуса судна, яго машын і прылад, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі адзінаццаць і болей гадоў на момант аварыі судна.

У дачыненні да суднаў, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі не больш за два гады на момант аварыі, скідкі «за новае замест старога» не робяцца з кошту часовага рамонту, а таксама з кошту якараў і якарных ланцугоў, буксірных і прычальных тросаў.

Скідкі «за новае замест старога» павінны рабіцца толькі з кошту матэрыялаў або частак судна, гатовых для ўстаноўкі на яго борце.

Страты ад пашкоджання судна не павінны перавышаць сумы расходаў, якія кампенсуюцца ў выпадку гібелі судна.

**Артыкул 142. Страты ад гібелі або пашкоджання грузу**

Страты, якія адносяцца да агульнай аварыі ад гібелі або пашкоджання грузу, вызначаюцца ў адпаведнасці з коштам грузу на момант яго выгрузкі на падставе гандлёвага рахунка, выстаўленага атрымальніку, а пры адсутнасці рахунка – на падставе кошту грузу на момант яго адгрузкі.

Кошт грузу на момант яго выгрузкі ўключае выдаткі на страхаванне і правазную плату, калі толькі правазная плата не знаходзіцца на рызыцы грузаўладальніка.

У выпадку рэалізацыі пашкоджанага грузу страты, якія адносяцца да агульнай аварыі, складаюць розніцу паміж коштам грузу ў непашкоджаным стане, які вызначаецца ў адпаведнасці з часткай першай гэтага артыкула, і чыстай выручкай ад яго рэалізацыі.

**Артыкул 143. Страты ад згубы правазной платы**

Неаплачаная правазная плата за страчаны або ахвяраваны груз кампенсуецца ў памеры страчанай правазной платы.

**Артыкул 144. Працэнты на страты, якія кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі**

На суму выдткаў і іншыя сумы, якія кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі (страты), налічаюцца 7 працэнтаў гадавых на працягу трох месяцаў пасля даты стварэння дыспашы. Пры гэтым належным чынам улічваюцца выплаты, праведзеныя за кошт удзельнікаў у пакрыцці агульнай аварыі або за кошт дэпаніраваных для яе пакрыцця грашовых сродкаў.

**Артыкул 145. Кантрыбуцыйны кошт маёмасці**

Агульны кошт маёмасці (судна, грузу і правазной платы), адпаведна якой устанаўліваюцца ўзносы на пакрыццё страт, якія кампенсуюцца ў парадку размеркавання агульнай аварыі (кантрыбуцыйны кошт), вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым артыкулам, на аснове сапраўднага чыстага кошту дадзенай маёмасці пасля заканчэння рэйса судна.

Кантрыбуцыйны кошт судна вызначаецца зыходзячы з кошту судна ў пашкоджаным стане.

Кантрыбуцыйны кошт грузу вызначаецца на момант выгрузкі грузу зыходзячы з кошту, які ўстанаўліваецца на падставе гандлёвага рахунка, выстаўленага атрымальніку, а пры адсутнасці рахунка – на падставе кошту грузу на момант яго адгрузкі. Кошт грузу ўключае выдаткі на страхаванне і правазную плату, калі толькі правазная плата не знаходзіцца на рызыцы грузаўладальніка. З кошту грузу ўтрымліваюцца сумы ўсіх страт ад гібелі або пашкоджання грузу да выгрузкі або падчас яго выгрузкі.

Кантрыбуцыйны кошт правазной платы, якая знаходзіцца на рызыцы перавозчыка, роўны страчанай правазной плаце.

Да кантрыбуцыйнага кошту маёмасці (судна, грузу і правазной платы) дадаецца сума, якая кампенсуецца ў парадку размеркавання агульнай аварыі, калі толькі дадзеная сума ў яго не ўключана.

Любыя сродкі ўмацавання грузавых месцаў улічваюцца ва ўзносах па агульнай аварыі нароўні з грузам.

**Артыкул 146. Дыспаша і дыспашэры**

На заяву зацікаўленых асоб устанаўліваецца наяўнасць агульнай аварыі і асобы, якія валодаюць ведамі і вопытам у галіне ўнутранага воднага транспарту (дыспашэрамі), складаюць разлік для яе размеркавання (дыспаша).

**Артыкул 147. Матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша**

Асоба, інтарэсы якой могуць быць закрануты складаннем дыспашы, на працягу аднаго года з дня заканчэння агульнай справы падае дыспашэру заяву ў пісьмовай форме аб стратах або расходах, пакрыццё якіх яна патрабуе.

У выпадку, калі такая заява не пададзена або на працягу аднаго года пасля запыту аб такой заяве асоба не прадставіць доказаў у мэтах абгрунтавання заяўленага патрабавання або даных аб кошце маёмасці, дыспашэр мае права скласці дыспашу на аснове інфармацыі, якая ў яго ёсць. Пры гэтым дыспаша можа аспрэчвацца толькі на той падставе, што яна з'яўляецца яўна няправільнай.

Пры ўзнікненні падчас складання дыспашы пытанняў, якія патрабуюць для іх вырашэння спецыяльных ведаў у галіне суднаваджэння, суднабудавання, рамонту суднаў і іншых галінах, дыспашэр мае права даручыць падрыхтаваць адпаведнае заключэнне прызначанаму ім эксперту. У частцы ацэнкі кошту суднаў і грузаў дыспашэр мае права заказаць незалежную ацэнку выканаўцу ацэнкі, які мае права на правядзенне ацэнкі адпаведнага віду аб'екта ацэнкі. Такія заключэнні прымаюцца дыспашэрам нароўні з іншымі доказамі.

Матэрыялы, на падставе якіх складаецца дыспаша, павінны быць адкрыты для азнаямлення, і дыспашэр на патрабаванне зацікаўленых асоб абавязаны за іх кошт выдаваць ім завераныя копіі дадзеных матэрыялаў.

**Артыкул 148. Плата за складанне дыспашы**

За складанне дыспашы спаганяецца плата, якая ўключаецца ў дыспашу і размяркоўваецца паміж усімі зацікаўленымі асобамі прапарцыянальна долям іх удзелу ў агульнай аварыі.

**Артыкул 149. Выпраўленне і аспрэчванне дыспашы**

Памылкі ў разліках, выяўленыя ў дыспашы пасля яе рэгістрацыі ў рэестры дыспаш, могуць быць выпраўлены дыспашэрам па сваёй ініцыятыве або на заяву асоб, паміж якімі размеркавана агульная аварыя, пры дапамозе складання дадатку да дыспашы (адэндуму), які з'яўляецца яе складальнай часткай.

Асобы, паміж якімі размеркавана агульная аварыя, могуць аспрэчыць дыспашу ў судзе на працягу шасці месяцаў з дня атрымання дыспашы або адэндуму да яе з абавязковым паведамленнем аб гэтым дыспашэру пры дапамозе накіравання яму копіі іскавай заявы.

Дыспашэр мае права або, калі спатрэбіцца, абавязаны ўдзельнічаць у разглядзе спрэчкі аб дыспашы ў судзе і даць тлумачэнні аб сутнасці справы.

Суд, які разглядае спрэчку аб дыспашы, можа пакінуць дыспашу ў сіле, унесці ў яе змяненні або адмяніць яе і даручыць дыспашэру скласці новую дыспашу ў адпаведнасці з рашэннем суда.

**Артыкул 150. Выкананне дыспашы**

У выпадку, калі дыспаша не аспрэчана ў тэрмін, прадугледжаны часткай другой артыкула 149 гэтага Кодэкса, або аспрэчана, але пакінута судом у сіле, спагнанне па ёй можа быць праведзена ў парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 15
## РАТАВАННЕ ЛЮДЗЕЙ, СУДНАЎ І ІНШАЙ МАЁМАСЦІ

**Артыкул 151. Агульныя палажэнні аб ратаванні людзей, суднаў і іншай маёмасці**

Пад выратавальнай аперацыяй разумеюцца любыя дзеянні або дзейнасць, якія робяцца для ратавання людзей, суднаў, плывучых аб'ектаў, а таксама іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў небяспецы ў межах унутраных водных шляхоў і не прымацавана пастаянна і наўмысна да берага.

Палажэнні гэтай главы прымяняюцца да любых выратавальных аперацый на ўнутраных водных шляхах, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або дагаворам аб ратаванні не прадугледжана іншае.

Палажэнні гэтай главы прымяняюцца і ў тым выпадку, калі выратаванае судна і судна, якое ажыццявіла выратавальную аперацыю, належаць аднаму суднаўладальніку.

Палажэнні гэтай главы не прымяняюцца да выратавальных аперацый, якія ажыццяўляюцца без прыцягнення суднаў.

**Артыкул 152. Дагаворы аб ратаванні**

Капітан (камандзір) судна мае права заключаць дагаворы аб ратаванні ад імя суднаўладальніка. Капітан (камандзір) судна або суднаўладальнік маюць права заключаць такія дагаворы ад імя ўладальніка маёмасці, якая знаходзіцца на борце судна.

Калі ўмовы дагавора аб ратаванні, заключанага ў момант і пад уплывам небяспекі, з'яўляюцца неправамернымі, зацікаўлены бок можа патрабаваць змянення такога дагавора або прызнання яго несапраўдным у судовым парадку.

**Артыкул 153. Выдаткі асобы, якая аказала дапамогу, і спецыяльная кампенсацыя**

Выдаткі асобы, якая аказала дапамогу, уключаюць фактычныя выдаткі, разумна праведзеныя асобай, якая аказала дапамогу, пры ажыццяўленні выратавальнай аперацыі, а таксама справядлівую плату за абсталяванне і персанал, фактычна і разумна выкарыстаныя ў ходзе выратавальнай аперацыі.

Калі асоба, якая аказала дапамогу, ажыццявіла выратавальную аперацыю ў дачыненні да судна або грузу, які перавозіцца на ім, і ў адпаведнасці з часткай шостай артыкула 154 не атрымала права на ўзнагароджанне, яна мае права на атрыманне ад суднаўладальніка спецыяльнай кампенсацыі, роўнай яго расходам, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула.

Калі пры абставінах, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула, асоба, што аказала дапамогу, у выніку ажыццёўленай ім выратавальнай аперацыі прадухіліла або зменшыла шкоду, якая прычыняецца навакольнаму асяроддзю, спецыяльная кампенсацыя, якая выплачваецца суднаўладальнікам асобе, якая аказала дапамогу, згодна з часткай другой гэтага артыкула, павялічваецца да 30 працэнтаў. Спецыяльная кампенсацыя можа быць павялічана ў судовым парадку, аднак яе агульнае павелічэнне не можа перавышаць агульнай сумы расходаў, панесеных асобай, якая аказала дапамогу.

Агульная спецыяльная кампенсацыя выплачваецца, згодна з гэтым артыкулам, толькі ў тым выпадку і ў такім памеры, у якім яна перавышае любое ўзнагароджанне, што можа быць атрымана асобай, якая аказала дапамогу, згодна з артыкулам 154 гэтага Кодэкса.

Калі асоба, якая аказала дапамогу, праявіла нядбайнасць і з прычыны гэтага не змагла прадухіліць або зменшыць шкоду, што прычыняецца навакольнаму асяроддзю, яна можа быць поўнасцю або часткова пазбаўлена спецыяльнай кампенсацыі.

Палажэнні, якія ўтрымліваюцца ў гэтым артыкуле, не закранаюць правы суднаўладальніка на рэгрэсныя іскі.

**Артыкул 154. Умовы выплаты ўзнагароджання за выратавальныя аперацыі**

Узнагароджанне павінна выплачвацца за паспяхова ажыццёўленую выратавальную аперацыю.

Узнагароджанне выплачваюць ўсе асобы, зацікаўленыя ў выратаваных судне, грузе або іншай маёмасці, прапарцыянальна іх выратаванаму кошту.

Узнагароджанне вызначаецца ў мэтах заахвочвання ажыццяўлення выратавальных аперацый з улікам наступных крытэрыяў:

выратаванага кошту судна і іншай маёмасці;

ступені поспеху, дасягнутага асобамі, якія аказалі дапамогу;

характару і ступені небяспекі выратавальнай аперацыі;

хуткасці аказання паслуг, майстэрства і намаганняў асоб, якія аказалі дапамогу;

затрачанага асобамі, якія аказалі дапамогу, часу і панесеных імі расходаў або страт;

рызыкі, якой падвяргаліся асобы, якія аказалі дапамогу, і іх маёмасць;

эфектыўнасці і кошту абсталявання, прымененага асобамі, якія аказалі дапамогу.

Сума выратавальнага ўзнагароджання не павінна перавышаць кошты выратаваных судна або іншай маёмасці.

Размеркаванне ўзнагароджання паміж асобамі, якія аказалі дапамогу, праводзіцца з улікам крытэрыяў, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула.

Асоба, што аказала дапамогу, можа быць поўнасцю або часткова пазбаўлена ўзнагароджання, належнага яму згодна з палажэннямі гэтай главы, у той меры, у якой выратавальныя аперацыі аказаліся неабходнымі або болей цяжкімі па яе віне, калі дагаворам аб ратаванні не прадугледжана іншае.

Спрэчкі, якія ўзнікаюць аб памеры і размеркаванні ўзнагароджання за выратавальную аперацыю вырашаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 155. Размеркаванне ўзнагароджання за выратавальную аперацыю паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна**

Размеркаванне паміж суднаўладальнікам і экіпажам судна любога ўзнагароджання, атрыманага за ажыццяўленне выратавальнай аперацыі, а таксама разгляд спрэчак праводзяцца ў парадку, які ўстанаўлівае рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

Пры арэндзе судна з экіпажам узнагароджанні, атрыманыя ім за ажыццяўленне выратавальных аперацый падчас дзеяння дагавора арэнды (фрахтавання на час) судна з экіпажам, размяркоўваюцца ў роўных долях паміж арандатарам і арэндадаўцам за вылікам выдаткаў, панесеных суднаўладальнікам, і долі, належнай экіпажу судна.

**Артыкул 156. Ратаванне людзей**

Ратаванне людзей, якія знаходзяцца на судне, арганізуе капітан (камандзір) судна.

Любое судна можа быць прыцягнута да забеспячэння і ажыццяўлення аперацый для ратавання людзей. Парадак прыцягнення суднаў да ажыццяўлення аварыйна-выратавальных работ і парадак пакрыцця выдаткаў на іх ажыццяўленне ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Ратаванне людзей не ўзнагароджваецца.

**Артыкул 157. Забеспячэнне выканання абавязацельстваў па ратаванні**

На патрабаванне асобы, якая аказала дапамогу, асоба, абавязаная зрабіць выплаты ў адпаведнасці з гэтай главой, павінна забяспечыць выкананне абавязацельстваў у дачыненні да асобы, якая аказала дапамогу, прадугледжанае заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

На ўладальніка выратаванага судна ўскладаецца абавязак прыняцця ўсіх неабходных мер, каб да выдачы выратаваных грузаў грузаатрымальнікам атрымаць ад іх належнае забеспячэнне выканання абавязацельстваў у дачыненні да патрабаванняў асобы, якая аказала дапамогу.

Без згоды асобы, якая аказала дапамогу, выратаваныя судна і іншая маёмасць не могуць быць перамешчаны з месца, куды яны былі дастаўлены пасля завяршэння выратавальных аперацый, датуль, пакуль не будзе належным чынам забяспечана выкананне абавязацельстваў у дачыненні да патрабаванняў асобы, якая аказала дапамогу.

**Артыкул 158. Размеркаванне страт пры ратаванні**

Суднаўладальнік, грузаадпраўшчык, грузаатрымальнік мае права дамовіцца аб тым, што страты, панесеныя імі з прычыны наўмысна і разумна праведзеных надзвычайных расходаў з мэтай аховы судна і грузу ад агульнай для іх непасрэднай небяспекі, будуць размяркоўвацца паміж імі прапарцыянальна кошту судна, грузу і заплачанай або падлеглай выплаце правазной плаце. Гэта дамоўленасць не закранае праў на прад'яўленне прэтэнзій аб пакрыцці ўрону, заснаваных на дагаворы перавозкі

грузу ўнутраным водным транспартам, або на іх прад'яўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Размеркаванне страт, прадугледжанае часткай першай гэтага артыкула, праводзіцца толькі ў тым выпадку, калі судна або груз былі поўнасцю або часткова выратаваны.

Разлік страт, якія падлягаюць размеркаванню, праводзіцца па ініцыятыве аднаго з зацікаўленых бакоў. Абавязак даказваць, што панесеныя страты падлягаюць размеркаванню, ляжыць на баку, які патрабуе гэта.

Парадак і ўмовы разліку страт вызначаюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў галіне ўнутранага воднага транспарту.

За стварэнне разліку страт спаганяецца плата, якая ўключаецца ў гэты разлік і падлягае размеркаванню паміж бакамі, якія удзельнічаюць у размеркаванні страт.

## ГЛАВА 16
## КАМЕРЦЫЙНЫЯ АКТЫ, АКТЫ АГУЛЬНАЙ ФОРМЫ, ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ

### Артыкул 159. Камерцыйныя акты, акты агульнай формы

Абставіны, якія служаць падставай для маёмаснай адказнасці перавозчыка (буксіроўшчыка), грузаадпраўшчыка, грузаатрымальніка або пасажыра, сведчацца камерцыйнымі актамі або актамі агульнай формы.

Камерцыйны акт складаецца пры выдачы грузу або багажу для засведчання:

неадпаведнасці фактычнага наймення грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта, а таксама масы грузу ці колькасці месцаў (пакетаў) або багажу даным, указаным у перавозачным дакуменце;

пашкоджання (псуты) грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або плывучага аб'екта;

выяўлення грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта без перавозачных дакументаў або перавозачных дакументаў без грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта;

недастачы драўніны і такелажу ў аварыйных вязальных адзінках у плыце;

вяртання перавозчыку выкрадзеных або страчаных грузу або багажу.

Недастача або пашкоджанне нафты і нафтапрадуктаў, якія перавозяцца налівам, сведчацца перавозачнымі дакументамі ў парадку, установленым Правіламі перавозак грузаў.

Камерцыйны акт не складаецца:

пры недастачы масы грузу пры перавозцы ўнутраным водным транспартам у межах норм натуральнай страты, зніжэння працэнта вільготнасці або засмечанасці, дапусцімай хібнасці ў паказаннях вагаў, розніцы ў масе грузу, прынятага да перавозкі ўнутраным водным транспартам на ўмовах разлікаў па выніках за навігацыю;

пры выдачы грузу, які прыбыў у тэхнічна спраўным судне або кантэйнеры з непашкоджанымі запорна-пламбіровачнымі прыладамі або ў суправаджэнні прадстаўніка грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка.

Акты агульнай формы складаюцца для сведчання абставін, не прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула.

Формы камерцыйнага акта і акта агульнай формы, а таксама парадак іх складання ўстанаўліваюцца Правіламі перавозак грузаў і Правіламі перавозак пасажыраў і багажу.

**Артыкул 160. Парадак прад'яўлення прэтэнзій**

Да прад'яўлення іску, які вынікае з перавозкі ўнутраным водным транспартам пасажыраў, грузаў і багажу або буксіроўкі судна, плыта або іншага плывучага аб'екта, абавязковым з’яўляецца прад'яўленне перавозчыку (буксіроўшчыку) прэтэнзіі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Прэтэнзіі прад'яўляюцца ў пісьмовай форме.

Прэтэнзіі, якія ўзнікаюць з прычыны перавозкі ўнутраным водным транспартам грузаў і буксіроўкі судна, плыта або іншага плывучага аб'екта, прад'яўляюцца да перавозчыка (буксіроўшчыка) у пункце прызначэння.

Прэтэнзіі, якія ўзнікаюць з прычыны перавозкі ўнутраным водным транспартам пасажыраў і багажу, могуць быць прад'яўлены да перавозчыка ў пункце адпраўлення або ў пункце прызначэння паводле меркавання заяўніка.

Да прэтэнзіі павінны быць прыкладзены копіі дакументаў, якія сведчаць аб наяўнасці ў заяўніка права на прад'яўленне прэтэнзіі. Да прэтэнзіі аб страце, недастачы або пашкоджанні (псуце) грузу, багажу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта павінны быць прыкладзены дакументы, якія сведчаць колькасць і кошт адпраўленага грузу, багажу, а таксама кошт буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта.

Прэтэнзіі да перавозчыка (буксіроўшчыка) могуць быць прад'яўлены на працягу тэрміну іскавай даўнасці. Тэрміны прад'яўлення прэтэнзій лічацца ў дачыненні да:

пакрыцця ўрону за страту грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта – пасля сканчэння 30 сутак з дня заканчэння тэрміну дастаўкі;

пакрыцця ўрону за недастачу, пашкоджанне (псуту), пратэрміноўку дастаўкі грузу або багажу, звароту залішне заплачаных правазных выплат – з дня выдачы грузу або багажу;

пратэрміноўкі дастаўкі пасажыраў – з дня заканчэння перавозкі ўнутраным водным транспартам;

буксіроўкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў – з дня заканчэння буксіроўкі;

недастачы аднародных масавых грузаў, якія перавозяцца налівам, навалам або насыпам і абязлічаных пры перавозцы ўнутраным водным транспартам, – з дня падпісання акта штогадовай зверкі разлікаў;

іншых выпадкаў, якія ўзнікаюць у сувязі з выкананнем перавозкі ўнутраным водным транспартам, – з дня наступлення падзей, якія паслужылі падставай для прад'яўлення прэтэнзіі.

**Артыкул 161. Права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў**

Права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў да перавозчыка (буксіроўшчыка) маюць:

грузаадпраўшчык або грузаатрымальнік – пры ўмове прадстаўлення імі квітанцыі аб прыёме грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта да перавозкі ўнутраным водным транспартам з адзнакай перавозчыка (буксіроўшчыка) аб непрыбыцці грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта ў выпадку поўнай страты грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта;

грузаатрымальнік – пры ўмове прадстаўлення ім канасамента, камерцыйнага акта, а пры адсутнасці камерцыйнага акта – дакумента аб абскарджанні адмовы ў яго

стварэнні ў выпадку недастачы або пашкоджання (псуты) грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта;

грузаадпраўшчык і грузаатрымальнік – пры ўмове прадстаўлення імі канасамента ў выпадку залішне заплачаных правазной платы і іншых выплат;

асоба, якая прад'явіла багажную квітанцыю, – пры страце багажу;

прад'яўнік выдадзенага перавозчыкам камерцыйнага акта аб недастачы або пашкоджанні (псуце) багажу – у выпадку недастачы або пашкоджання (псуты) багажу;

пасажыр пры прад'яўленні праязнога дакумента (білета) – па патрабаваннях, якія вынікаюць з дагавора перавозкі пасажыра ўнутраным водным транспартам;

грузаатрымальнік – пры ўмове прадстаўлення канасамента ў выпадку пратэрміноўкі ў дастаўцы грузу, буксаванага судна, плыта або іншага плывучага аб'екта.

**Артыкул 162. Тэрміны разгляду прэтэнзій**

Перавозчык (буксіроўшчык) абавязаны разгледзець прад'яўленую прэтэнзію і аб выніках яе разгляду паведаміць у пісьмовай форме заяўніку на працягу 30 каляндарных дзён з дня прад'яўлення прэтэнзіі.

У паведамленні перавозчыка (буксіроўшчыка) пры частковым задавальненні прэтэнзіі або адмове ў яе задавальненні павінна быць указана падстава прынятага рашэння са спасылкай на адпаведныя нарматыўныя прававыя акты. У гэтым выпадку прыкладзеныя да прэтэнзіі дакументы і копіі дакументаў вяртаюцца яе прад'яўніку.

**Артыкул 163. Тэрміны іскавай даўнасці**

Іскі да перавозчыка (буксіроўшчыка), якія ўзніклі ў сувязі з выкананнем перавозкі грузаў, багажу, буксіроўкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, могуць быць прад'яўлены ў выпадку поўнай або частковай адмовы перавозчыка (буксіроўшчыка) забяспечыць прэтэнзію або ў выпадку неатрымання адказу перавозчыка (буксіроўшчыка) на прад'яўленую прэтэнзію на працягу 30 каляндарных дзён з дня яе прад'яўлення.

Падлік тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца на наступны дзень пасля атрымання прад'яўнікам прэтэнзіі паведамлення аб частковым задавальненні прэтэнзіі, аб адмове ў яе задавальненні або пасля неатрымання адказу ва ўстаноўлены тэрмін.

Тэрмін іскавай даўнасці вызначаецца:

па патрабаваннях да перавозчыка (буксіроўшчыка), якія вынікаюць з прычыны перавозкі грузаў, буксіроўкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, – адзін год;

па патрабаваннях да перавозчыка, якія вынікаюць з прычыны перавозкі пасажыраў і багажу, – шэсць месяцаў.

Іскі перавозчыкаў (буксіроўшчыкаў) да пасажыраў, грузаадпраўшчыкаў, грузаатрымальнікаў, іншых юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўзнікаюць ў сувязі з выкананнем перавозкі пасажыраў, грузаў і багажу або буксіроўкі суднаў, плытоў або іншых плывучых аб'ектаў, могуць быць прад'яўлены на працягу аднаго года з моманту наступлення падзеі, якая паслужыла падставай для прад'яўлення іску.

### Артыкул 164. Прымяненне агульных тэрмінаў іскавай даўнасці

Да патрабаванняў, для якіх тэрміны іскавай даўнасці гэтым Кодэксам не ўстаноўлены, прымяняюцца агульныя тэрміны іскавай даўнасці.

## ГЛАВА 17
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 165. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса

Гэты Кодэкс уступае ў сілу з 1 студзеня 2003 года.

### Артыкул 166. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам

Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 студзеня 2004 года:

прывесці акты Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка**